ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.

# ПАГОНЯ

№ 33 (132) 1 - 7 верасьня 1995 г. Кошт 600 рублёў

РЭФЕРЭНДУМ БУДЗЕ АДМЕНЕНЫ - ст. 2.

БЕЛАРУСІ НЕАБХОДНЫ САПРАЎДНЫЯ РЭФОРМЫ - ст. 3.

ВЫВОЗЯЦЬ ЗЕРНЕ У РАСЕЮ - ст. 4.

ПРАГРАМА ТЭЛЕБАЧАНЬНЯ НА ТЫДЗЕНЬ: Менск - Варшава - Масква - Санкт-Пецярбург.

## «ПАРТА ШКОЛЬНАЯ МНЕ СЬНІЦЦА...»

**Прачнуўшыся ад жудаснага хваляваньня за нявывучаны ўрок, я ўжо больш не заснула. Бо з вуліцы цягнула сьвежасьцю і сьпелымі яблыкамі. Бо закончыўся жнівень - мой любімы месяц. Бо з неба сыпаліся зоркі. Бо заўтра пачыналася восень і новы навучальны год...**

Я вазьму ў сваю руку даверлівую маленькую ручку сына, і мы разам пакрочым да знаёмага будынку (Цікава, хто з нас будзе хвалявацца больш? Мабыць, я...)

«Дзень добры, школа!» - скажам мы. Няўрымсьлівы Алёшка, убачыўшы любімую Галіну Іванаўну і сяброў-аднакласьнікаў, растварыцца ў стракатым натоўпе. А я застануся адна. Сам-насам са сваімі ўспамінамі. Прайду па знаёмых калідорах. Пастаю ля настаўніцкай. Мой 10 «Б» разьвітаўся з гэтай школай 16 год таму...

У віры дзён і падзей мы так рэдка ўспамінаем, што ёсьць гэты цуд -дзяцінства, напоенае пяшчотай і сьвятлом. ёсьць школа. першая настаўніца, школьныя сябры. Памятаеце? Перш, чым стаць кімсьці, усе мы былі проста вучнямі. Мы яшчэ ня ведалі, што давядзецца разьвітацца са сваімі ідэаламі, што дабро не заўсёды перамагае зло, і жыцьцё -рэч вельмі жорсткая. Ва ўсіх нас былі Пунсовыя ветразі...

*Верасьнёўскія матывы.*

Мы пісалі пісьмы ў мінулае стагоддзе Базараву і абвінавачвалі Анегіна ў нежаданьні па-сапраўднаму кахаць, выказвалі салідарнасьць патрыётам Чылі і ўпотай пісалі вершы. І ці маглі ўявіць, што з нас, легкадумных, атрымаюцца лекары і педагогі, лётчыкі і фінансісты, падводнікі і аграномы, інжынеры і прадпрымальнікі, чыгуначнікі і заатэхнікі, артысты і журналісты?! Пра гэта ведалі толькі нашы настаўнікі. Бо для іх мы былі адкрытай кнігай, старонкі якой пісалі яны самі.

Настаўнікі вялі нас ад дзіцячых каракуляў, няўмела напісанага слова «мама» да сачыненьняў на філасофскія тэмы, ад найпрасьцейшага складваньня лічбаў да формулы Герона, ад «Чырвонай шапачкі» да раманаў Караткевіча. Але, бадай, самае галоўнае, чаму яны вучылі нас - любіць Радзіму.

...Я ніколі не абвінавачу сваіх старых настаўнікаў у няшчырасьці і недальнабачнасьці. Яны верылі ў тое, чаму вучылі нас. Непатрэбнае, наносное забылася само па сабе. А галоўнае засталося: маральны стрыжань, некалі закладзены педагогамі ў нашыя душы, вытрымлівае ўсе жыцьцёвыя цяжкасьці.

Таму і ў трыццаць пяць, і ў сорак, і ў пяцьдзесят мы будзем прыходзіць сюды, у нашу школу, каб зноў пераўтварацца ў Сьветак, Кацяў, Сашкаў, Сярожкаў, Віцяў... Таму доўгія гады ўсім нам будуць сьніцца школьная парта і любімы ўрок... Таму як бы ні складўся наш далейшы лёс мы будзем любіць гэтую зямлю, якая называецца Беларусь, з замірaньнем сэрца вяртацца ў сваю родную школу і гаварыць: «Дзень добры, школа! Дзень добры, наш дом!»

**Ала БІБІКАВА.**
**Фота Б.МЕШЧАРАКОВА.**

## АКАЗВАЕЦЦА, ЗА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ

**На пачатак навучальнага года крытычная сітуацыя склалася ў школах Горадні з беларускамоўнымі класамі. Цяпер ужо можна з упэўненасьцю сказаць пра мэтанакіраваную кампанію па вынішчэньню беларускага школьніцтва. Паказальным зьяўляецца становішча ў 10-й сярэдняй школе з ангельскім ухілам. Тут беларускія класы зьліквідаваны ўвогуле.**

Нягледзячы на тое, што дзеткі ўжо навучаліся на роднай мове і на наяўнасьць бацькоўскіх заяў у першы клас, дырэктарка сп.Касьяновіч заняла непрабівальную пазіцыю. Відаць, шаноўны педагог лічыць несумяшчальнай ангельскую мову з беларускай. Адна з высокапастаўленых асобаў з гарана нават заявіла, што за навучаньне на беларускай мове трэба плаціць.

Большасьць бацькоў проста зьбіта з панталыку пад ціскам хлусьлівай прапаганды. Асноўны акцэнт пры гэтым робіцца на вынікі прэзідэнцкага рэферэндуму, што выглядае зусім абсурдным. Па-першае, ягоныя вынікі ня маюць пакуль сілы закону. Па-другое, нават пасьля ратыфікацыі, яны не касуюць дзяржаўнасьці беларускай мовы і права выбару навучаньня.

**Уладзімір МАЙНІЧ.**

## КАБ БАЯЛІСЯ!

**Заварыўшы кашу з адменай падручнікаў, Лукашэнка зусім нечакана выявіў дзіўную зьяву. Аказваецца, дзяржава і саўгас - гэта розныя рэчы.**

У саўгасе можна спачатку барановаць, а пасьля араць, а ў дзяржаве гэта цяжэй. Адмяніць адны падручнікі, не выпусьціўшы іншых, аказалася не пад сілу нават «бацьку». Але «бацька» ён і ёсьць «бацька» і вінаватым за тое, што чарговы раз з усёй камандай пляснуўся ў лужыну, быць ня можа. Але вінаватыя быць павінны, бо «пырскі» надта ж вялікія. А калі павінны, дык чаго іх тут доўга шукаць. Раз, і зьнялі двух намесьнікаў міністра адукацыі, ды колькі дробных клеркаў. За што? А каб баяліся!

Чаму не зьнялі самога міністра? Здымуць, калі высьветляць, што для масы новых рускамоўных класаў, якія на злосьць Пазьняку паадчынены на ўсёй Беларусі, няма нават «Буквароў».

**Ігнат ХІТРОВІЧ.**

**Увага! Падпіска працягнута да 10 верасьня. Падпіска на "ПАГОНЮ" прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленьнях. Кошт на квартал - 15 тыс. руб.**

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі Беларусі
"Белсаюздрук"

**АБАНЭМЭНТ** на газэту 63124

ПАГОНЯ

Колькасьць камплектаў 1

на 1995 год па месяцах:

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | XXX |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | |

Куды

(паштовы індэкс) (адрас)

Каму

(прозьвішча, ініцыялы)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА**

на газэту 63124

ПВ | Месца | мітэр

ПАГОНЯ

Кошт падпіскі / пера-адрасоўкі 15000 руб. / руб. Колькасьць камплектаў 1

на 1995 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | XXX |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | |

Куды

(паштовы індэкс) (адрас)

Каму

(прозьвішча, ініцыялы)

## ЖАНЧЫНЫ КАЖУЦЬ «БАСТА»!

**У перадзабастовачным стане знаходзіцца жаночы калектыў Кобрынскага тэкстыльнага вытворчага аб'яднаньня.**

Рабочыя ўжо чацьвёрты месяц працуюць без зарплаты, іх адпраўляюць у адпачынкі й ня плацяць адпускных - карацей, тая ж карціна, што назіраецца па ўсёй «запушчанай» Беларусі. Прадпрыемства яшчэ неяк трымаецца на плаву, таму што гатовай прадукцыяй разьлічваецца за сыравіну. Дарэчы, вырабы першага сорту тут часта ўмудраюцца ткаць з трэцьцясортнай сыравіны. Можа, таму й удаецца ўтрымацца?

**ЯГОРЫК.**

## ПРАДСТАЎНІКІ СПБ ПАЧАЛІ ПІКЕТАВАНЬНЕ

Магілёўская абласная рэгіянальная арганізацыя Свабоднага прафсаюзу Беларусі прыняла рашэньне пачаць калектыўныя працоўныя канфлікты на ўсіх прадпрыемствах вобласьці, дзе ёсьць арганізацыі СПБ. Гэта будзе рабіцца тады, калі хаця б у нечым адміністрацыя гэтых прадпрыемстваў парушае калектыўныя дагаворы. Акрамя таго, з 28 жніўня прадстаўнікі Свабоднага прафсаюзу пачалі пікетаваньне гэтых прадпрыемстваў.

**СІМ**

## ІТАЛІЮ ПАД АБЦАС

**На наступным тыдні на лідзкую абутковую фабрыку паступіць з Італіі сыравіна для вырабу жаночых зімовых боцікаў на футры. Італьянцы будуць забясьпечваць прадпрыемства матэрыяламі, прэс-формамі, а лідчане на сваіх вытворчых плошчах і сваімі сіламі будуць выпускаць прадукцыю.**

Згодна з папярэдняй дамоўленасьцю, з 80 тысяч пар абутку 40 тысяч паедзе ў Італію і 40 тысяч застенуцца ў Лізе, калі гэта будзе выгадна фабрыцы.

**Яраслаў ГРЫНЬКЕВІЧ.**

## НАСТАЛЬГІЯ ПА МІНУЎШЧЫНЕ - ХВАРОБА НЕВЫЛЕЧНАЯ

**З ранку па Шчучыне пранеслася навіна: нейкая кабета стаіць на каленях ля помніка Леніну. Людзі сьпяшаліся пабачыць: «Ну, нарэшце, прачнуліся і ў нас! Мітынгаваць пачалі!»**

Накрапваў дождж. Зьбіраліся цікаўныя. З Дому Саветаў выходзілі мясцовыя кіраўнікі. Падыходзілі міліцыянты. Усіх цікавіла адно: што падштурхнула жанчыну на неардынарны ўчынак, якія прэтэнзіі яна прад'яўляе, якія пазіцыі адстойвае.

«Хачу, каб не было вайны. Каб усе людзі жылі ў міры. Каб аб'ядналіся пятнаццаць рэспублік...»

- А хто Вы па нацыянальнасьці? Мо Вас пакрыўдзіў хто?

- Я ўкраінка. І ніхто мяне тут ня крыўдзіць. Але хачу, каб усе народы жылі адной сям'ёй... Як раней...

...Побач была царква. Таму многія прапаноўвалі кабеце схіліць калені перад Богам, а не перад чалавекам, які патапіў у крыві тысячы бязьвінных суайчыньнікаў. Тым больш, што яна лічыла сябе чалавекам веруючым і трымала ля сябе сумку з абразком, які зьбіралася падарыць царкве.

На жаль, царква была зачынена. Ды й муж падасьпеў. Сьцьвярджаючы, што яго жонка не зусім здаровы на галаву чалавек, ён пры дапамозе мясцовых вартаўнікоў правапарадку забраў сваю «палову» да дому.

**І.ВЫШЫВАНКА.**

# РЭФЕРЭНДУМ БУДЗЕ АДМЕНЕНЫ

**Днямі, абласное радыё рабіла «круглы стол» з лідарамі палітычных партый, якія дзейнічаюць у Горадні. Ад Беларускага Народнага Фронту ў перадачы ўдзельнічаў прафесар медінстытута, доктар медыцынскіх навук Алесь Астроўскі.**

**Нам падалося, што пытаньне радыёслухача і адказ на яго, будуць цікавы таксама і чытачам «Пагоні».**

**ПЫТАНЬНЕ: Чаму Астроўскі за беларусізацыю? Быў рэферэндум, які паказаў, што людзі за рускую мову.**

А.АСТРОЎСКІ: Мы - за беларусізацыю таму, што беларусізацыя - гэта нармалізацыя, гэта вяртаньне нашага грамадзтва да нармальнага стану пасьля 200-гадавога навязваньня чужой волі. Вазьміце любую цывілізаваную краіну, народ якой жыве на сваёй гістарычнай тэрыторыі. Ва ўсіх гэтых краінах рэалізаваны прынцып: ёсьць народ і гэты народ мае, як сваю дзяржаву, так і сваю культуру. Вось гэта норма. Так і павінна быць. І так будзе ў нас на Беларусі, што б не жада-лі зрабіць носьбіты тых ці іншых варыянтаў імперскай ідэі.

Што датычыцца адбыўшагася нібыта рэферэндуму, дык трэба адзначыць, што ПА-ПЕРШАЕ, ня трэба перавіраць сутнасьць фармуліроўкі першага пытаньня. Яно было зьвязана не з заменай беларускай мовы на рускую, а, як усе памятаюць, з наданьнем рускай мове такога ж статусу, як у беларускай. Гэта значыць, што беларуская мова, нават пасьля рэферэндуму, як была, так і засталася на Беларусі ПЕРШАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ мовай з усімі вынікаючымі адсюль наступствамі.

ПА-ДРУГОЕ, гэтая акцыя (я маю на ўвазе рэферэндум, асабліва два яго першыя пытаньні) была АМАРАЛЬНАЯ. Уявіце сабе: 200 год навязвалася руская мова. Людзям не давалі вучыцца на роднай, беларускай мове, забаранялі яе выкарыстаньне ў важнейшых сьферах грамадзкага жыцьця, носьбітаў нацыянальна-культурніцкіх ідэй проста фізічна зьнішчалі (напрыклад, у 20-40-я гады пад выглядам барацьбы з гэтак званай нацдэмаўшчынай было зьнішчана больш 90% Саюзу пісьменьнікаў Беларусі, нават, Янка Купала быў забіты ў 42-м годзе), у часы Хрушчова і па яго загаду беларускія школы пераводзіліся на рускую мову навучаньня нават па сярэдзіне навучальнага года, і гэтак далей. Ў што, пасьля ўсяго гэта маральна пытацца ў народа што-небудзь пра мову?

Вось калі б прайшло хаця б 20-40 год нармальная беларусізацыя, тады б яшчэ аб нечым можна было казаць.

А так, пастаноўку моўнай праблемы на рэферэндум трэба лічыць проста амаральным, ганебным актам.

ПА-ТРЭЦЯЕ, вынясеньне праблемы статусу мовы, адносін да сімволікі было антызаконным. Паколькі ў адпаведнасьці з законам пытаньне аб правядзеньні рэферэндуму за поўгода да выбараў ВС на паседжаньні ВС разглядаецца ня можа. Больш таго, зноў жа па закону першыя два пытаньні на рэферэндум увогуле не выносяцца.

ПА-ЧАЦЬВЕРТАЕ, на рэферэндум не выносіцца адразу столькі пытаньняў, колькі было. Выносіцца адно, максімум два пытаньні, каб людзі маглі добра ў кожным разабрацца і прыняць дакладнае рашэньне.

Самі пытаньні павінны быць сфармуляваны так, каб была альтэрнатыва, бо нашыя людзі, ўсё жыцьцё галасаваўшыя «за» баяцца галасаваць «супраць». Трэба, каб было напісана:

- вы за тое, каб беларуская мова заставалася адзінай дзяржаўнай мовай на тэрыторыі Беларусі?

- ці вы за тое, каб руская мова набыла такі ж статус, як беларуская?

ПА-ПЯТАЕ, у перыяд агітацыі адносна пытаньняў рэферэндуму быў прадстаўлены толькі адзін пункт гледжаньня, што трэба галасаваць «за». Успомніце - па дзьве, а то і тры гадзіны выступаў прэзідэнт, успомніце двойчы паказаны ілжывы, паклёпніцкі фільм пра БНФ і беларускія нацыянальныя сімвалы, якім дарэчы не 50 гадоў, а ледзь не 1000.

Супрацьлеглых жа поглядаў па-сутнасьці прадстаўлена не было. У выніку народ быў падмануты.

Нарэшце, ШОСТАЕ. Рэферэндум не адбыўся.

Справа ў тым, што на тых выбарчых акругах, дзе вёўся (дзякуючы ў асноўным прадстаўнікам БНФ) добры кантроль ходу галасаваньня (у Менску, Горадні, Лідзе) высьветлілася, што на рэферэндум прыйшло 40-45% выбаршчыкаў. Мы дакладна ведаем, што на тых (у асноўным сельскіх акругах) дзе нібыта прыйшло 70-80% выбаршчыкаў, такія лічбы дасягаліся дзякуючы фальсіфікацыі.

Таму ,мы, прадстаўнікі БНФ, з-за ўсіх пералічаных вышэй акалічнасьцяў (а, дарэчы, у нармальным грамадзтве дастаткова было б і адной), не прызнаём вынікаў так званага рэферэндуму. Больш таго мы заяўляем, што адносіны да рэферэндуму становяцца крытэрыем нармальнасьці любога парламанту. Так, напрыклад, калі існуючы ВС прызнае прайшоўшы рэферэндум, гэта будзе азначаць, што законнасьць, маральнасьць, справядлівасьць большасьцю членаў ВС ігнаруюцца. Калі ж існуючы ВС прызнае такі рэферэндум, ён усё роўна будзе адменены першым жа нармальным парламантам.

# ЗАТРЫМАЛІ ПІКЕТЧЫКАЎ

28 жніўня ля будынка прэзідэнцкай адміністрацыі былі затрыманы 5 прадстаўнікоў Свабоднага прафсаюзу Беларусі а таксама лідар беларускай Сацыял-Дэмакратычнай грамады Мікола Статкевіч. Акцыя пачалася ў 11 гадзін. Віцэ-старшыня СПБ М.Зімін, сябры СПБ А.Гайло, В.Бусько, С.Валавік, Д.Курлоўскі трымалі плакаты з надпісамі «Патрабуем вызваліць незаконна затрыманых Быкава, Макарчука і Канаха», а таксама «Патрабуем аднавіць на працы незаконна звольненых работнікаў метрапалітэну». Лідар БСДГ патлумачыў свой удзел у пікетаваньні нежаданьнем мірыцца з парушэньнем правоў чалавека на Беларусі.

У 11.30 да пікетуючых пачалі падыходзіць міліцыянты, якія ахоўваюць будынак прэзідэнцкай адміністрацыі, з патрабаваньнем ачысьціць пляцоўку. Пікетчыкі праігнаравалі яго, пасьля чаго да месца правядзеньня акцыі пад'ехалі міліцэйскія машыны. У 12.05 удзельнікаў пікету пасадзілі ў машыны і павезьлі.

Як паведамілі ў штаб-кватэры БСДГ, затрыманых даставілі ў Ленінскі РАУС сталіцы. Пратрымаўшы каля паўгадзіны, іх адпусьцілі, не склаўшы пратакола.

# «САЛІДАРНАСЬЦЬ» НАПІСАЛА ЛУКАШЭНКУ

23 жніўня ўсяпольская камісія прафаб'яднаньня «Салідарнасьць» накіравала адкрыты ліст у адрас А.Лукашэнкі. У ім польскі прафсаюз абвінавачаньні ў свой адрас аб інсьпіраваньні падзей, зьвязаных з забастоўкай на Менскім метрапалітэне.

Адначасова ў лісьце выражаны пратэст супраць незаконных арыштаў прафсаюзных актывістаў Г.Быкава, У.Макарчука і М.Канаха.

**СІМ**

# АБЛАСНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ БНФ

**26 жніўня ў Лідзе прайшла справаздачна-выбарчая канферэнцыя Беларускага Народнага Фронту «Адраджэньне» Гарадзенскай вобласьці. На канферэнцыі прысутнічалі дэлегаты ад 13 арганізацый БНФ з 24 зарэгістраваных у вобласьці.**

Канферэнцыя заслухала справаздачу старшыні абласной Рады, разгледзела пазіцыі абласной арганізацыі напярэдадні выбараў, абрала кіраўніцтва абласной арганізацыі БНФ. Старшынёй Гарадзенскай абласной Рады БНФ «Адраджэньне» зноў абраны Мікола Баўсюк, намесьнікамі абраныя Міхась Ешчын з Горадні і Станіслаў Суднік з Ліды. Сябрамі Сойму БНФ «Адраджэньне» абраны Мікола Баўсюк і старшыня Гарадзенскай гарадзкой рады БНФ Кастусь Жынь.

Прынята рашэньне прыступіць да стварэньня ў вобласьці маладзёжнай арганізацыі БНФ.

**Вацлаў СЯРПІНСКІ.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АБВІНАВАЦІЎ ГЕНАДЗЯ КАРПЕНКУ

**22 жніўня ў інфармацыйнай праграме беларускага тэлебачаньня быў паказаны ўрывак інтэрв'ю журналіста з Краснаярску Генадзя Мікалаева з Аляксандрам Лукашэнкам. У ім прэзідэнт Беларусі, гаворачы пра дасягнутыя з Узбекістанам пагадненьні аб пастаўках хлопку, абвінавацiў беларускіх палітыкаў на чале з Генадзем Карпенкам у тым, што яны перашкаджалі пастаўцы хлопку ў рэспубліку. Па словах Аляксадра Лукашэнкі, гэтых людзей выкрыла контрразьведка.**

Наш карэспандэнт зьвярнуўся да Генадзя Карпенкі з просьбай пракаментаваць словы прэзідэнта. Спадар Карпенка сказаў, што «дадзеная заява мае правакацыйны характар, скіравана на дыскрэдытацыю мяне як грамадзяніна Беларусі і прыніжае мой гонар і годнасьць». У сувязі з гэтым, Генадзь Карпенка падаў у суд іск аб абароне гонару і годнасьці, у якім патрабаваў ад Аляксандра Лукашэнкі кампенсацыі маральнага ўрону ў памеры 2 мільярдаў беларускіх рублёў. Спадар Карпенка паведаміў таксама, што ніколі ня меў спраў з хлопкам, і ня ведае нават як ён расьце.

Начальнік контрразьведкі КДБ Уладзімір Абламскі за каментарамі накіроўваў журналістаў у прэс-службу камітэту, аднак зьвязацца з ёй ня ўдалося з прычыны адсутнасьці супрацоўнікаў прэс-службы на працоўным месцы.

# ЛІДАРЫ ДЭМАКРАТЫЧНАЙ АПАЗІЦЫІ ЗЬВЯРНУЛІСЯ ЗА ПАДТРЫМКАЙ ДА АМЕРЫКАНСКІХ І РАСЕЙСКІХ ПАЛІТЫКАЎ

**Лідар Беларускага Народнага Фронту Зянон Пазьняк, каардынатары дэмакратычнай апазіцыі ў Вярхоўным Савеце Сяргей Навумчык і Валянцін Голубеў 23 жніўня распаўсюдзілі заяву. Яна адрасавана прэзідэнту ЗША Білу Клінтану, членам Кангрэсу ЗША, прэзідэнту Расейскай Федэрацыі Барысу Ельцыну, дэпутатам Дзяржаўнай Думы Расеі.**

У заяве, у прыватнасьці, адзначаецца: «Зьвяртаемся да Вас у сувязі з пагрозай дэмакратыі ў Рэспубліцы Беларусь. Парушаюцца правы чалавека, абмежаваны свабода слова, згуртаваньняў, мітынгаў. Сістэматычна парушаюцца Канстытуцыя і законы краіны. Найбольш выразна гэта выявілася 12 красавіка, калі ў залу парламанту па распараджэньні прэзідэнта Лукашэнкі былі ўведзены войскі і зьбіты дэпутаты дэмактарычнай апазіцыі. 21 жніўня арыштаваны лідары рабочага руху. У гэты ж дзень без прад'яўленьня абвінавачаньня быў схоплены прадстаўнікамі ўлады аўтар дакладу аб карупцыі ў адміністрацыі прэзідэнта дэпутат парламанту Сяргей Антончык. Тры дні Антончык гвалтоўна ўтрымліваўся ў ізаляцыі на тэрыторыі часткаў Унутраных войск і ні дэпутаты, ні яго сям'я ня мелі зьвестак пра яго месца знаходжаньня. Да сёньняшняга дня невядомае месца знаходжаньня лідара Свабоднага прафсаюзу Генадзя Быкава і іншых актывістаў рабочага руху, затрыманых 21 жніўня.

Па словах першага намесьніка Генеральнага пракурора, прэзідэнт Лукашэнка падпісаў Указ аб зьняцьці дэпутацкай недатыкальнасьці. Гэты ўказ супярэчыць Канстытуцыі і законам краіны. Узьнікла рэальная пагроза расправы ня толькі над лідарамі дэмакратычнай апазіцыі, але і над усімі грамадзянамі Беларусі, якія выражаюць нязгоду з праводзімай прэзідэнтам палітыкай», - адзначаецца ў заяве.

# У ЗАКОН АБ ГРАМАДЗЯНСТВЕ МЯРКУЕЦЦА ЎНЕСЬЦІ ЗЬМЕНЫ

**Адбылася прэс-канферэнцыя, на якой былі абвешчаны зьмены ў законах, якія рыхтуюцца і будуць вынесіцца на разгляд чарговай сесіі Вярхоўнага Савету. Сакратар парламанцкай камісіі па міжнацыянальным зносінам і справам СНД Уладзімір Грыбанаў паведаміў, што камісіяй падрыхтаваны зьмены і дапаўненьні, якія тычацца закона аб грамадзянстве.**

Найбольш прынцыповыя зьмены тычацца павялічэньня цэнзу аседласьці (неабходнага для прыняцьця беларускага грамадзянства) з 5 да 7 гадоў; у закон мяркуецца ўнесьці норму, згодна якой беларускае грамадзянства можа быць прадстаўлена асобе, якая раней мела грамадзянства іншай дзяржавы, але адмовілася ад яе (раней грамадзянства РБ прадстаўлялася толькі асобам, ня меўшым грамадзянства іншай дзяржавы). Прапануецца зьменшыць тэрмін разгляду прашэньня аб адмове ад грамадзянства РБ з аднаго года да двух месяцаў. Па словах спадара Грыбанава, у закон мяркуецца ўнясеньне новага палажэньня, згодна якому сьпіс дакумантаў, неабходных для прыняцьця грамадзянства, будзе вызначацца самім прэзідэнтам.

Адказваючы на пытаньне, ці прадугледжваецца ва ўнесеных камісіяй зьменах увядзеньне падвойнага грамадзянства, спадар Грыбанаў адказаў: «Аб гэтым і ня можа ісьці размовы».

**СІМ**

# ШТРЭЙКБРЭХЕРАМ БЫЦЬ ВЫГАДНА

**22 машыністы і 12 работнікаў метро звольнены за ўдзел у забастоўцы Менскага метрапалітэну. Пра гэта паведамілі 28 жніўня ўдзельнікі прэс-канферэнцыі «Парушэньне права на працу ў Беларусі і сітуацыя вакол машыністаў менскага метро». Па іх словах, падчас забастоўкі вайскоўцы ўнутраных войск затрымалі 24 чалавекі. Затрыманых даставілі на базу ўнутраных войск у Менску. Там іх трымалі пад аховай байцоў «спецназа», абвінавачаньняў затрыманым не прад'яўлялі, даць адвакатаў ім адмовіліся.**

Па прыгавору суда на 10 сутак арыштаваны старшыня Свабоднага прафсаюзу Беларусі Г.Быкаў і старшыня прафкаму Прафсаюзу чыгуначнікаў на Менскім метрапалітэне М.Канах. Да 15 сутак арышту прыгавораны старшыня Свабоднага прафсаюзу работнікаў Менскага метрапалітэну У.Макаўчук. Каментуючы сваё нядаўняе затрыманьне, дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі С.Антончык заявіў, што «адміністрацыя прэзідэнта падрыхтавала неабходныя нарматыўныя акты, каб зьняць адказнасьць з праваахоўных ворганаў». «Лукашэнка ўсталёўвае рэжым абсалютнай улады», - лічыць С.Антончык.

Як паведаміў выконваючы абавязкі старшыні Свабодных прафсаюзаў Беларусі П.Майсіевіч, 28 жніўня ў Менску пачалося пікетаваньне будынкаў адміністрацыі прэзідэнта, Генеральнай пракуратуры краіны, Менскага гарвыканкаму і офіса адміністрацыі Менскага метрапалітэну.

Машыніст менскага метро і ўдзельнік забастоўкі Я.Куцькоў паведаміў, што бастуючых машыністаў метро замянілі каля шасьцюдзесяцьці машыністаў прыгарадных электрацягнікоў. На іх навучаньне, па словах Куцькова, адводзілася па 3 гадзіны. У выніку, некалькі разоў узьнікалі аварыйныя сітуацыі. За працу на працягу 4-х дзён забастоўкі штрэйкбрэхеры атрымалі па 1,5 мільёна рублёў, іх узнагародзілі граматамі і памятнымі гадзіньнікамі.

**«Э.-Х.»**

# СЛОВА ЗА ТАБОЙ, ВЫБАРШЧЫК!

**Тэма выбараў паступова выходзіць на першы план. Кіруючыя ворганамі партый, рухаў, аб'яднаньняў, грамадзкіх арганізацый, іх прадстаўнікі на месцах зноў і зноў аналізуюць вынікі папярэдніх спроб займець дэпутацкія паўнамоцтвы.**

Як вядома, у Гарадзенскі абласны Савет цяпер неабходна абраць 90 народных вылучэнцаў. Мандаты атрымалі 43 чалавекі. Сярод іх - 22 так званых беспартыйных. 16 прадстаўляюць Аграрную партыю. Партыя камуністаў здолела правесьці чатырох, Беларускі Народны Фронт - аднаго дэпутата.

Такім чынам, увосень барацьба пойдзе за астатнія 47 мандатаў. У сваёй бальшыні дэпутатамі стануць прадстаўнікі Горадні, а таксама амаль усіх гарадоў вобласьці. Бо менавіта тут выбары не адбыліся з прычыны нізкай яўкі выбаршчыкаў.

Хто ж будзе прэтэндаваць на пакуль што вакантныя дэпутацкія месцы? Прозьвішчы гэтых асобаў трэба шукаць у сьпісе кандыдатаў, надрукаваных у свой час «Гродзенскай праўдай». З невялікай папраўкай на тых, хто адважыцца выставіць свае кандыдатуры ўпершыню.

Пэўную інфармацыю даюць вынікі якраз тых выбараў, што не адбыліся. Аднак, кандыдаты набралі нейкую колькасьць галасоў. Прычым часьцяком працэнт актыўнасьці выбаршчыкаў быў высокім. Напрыклад, у Болдзінскай выбарчай акрузе - 34,8 працэнта, Універсітэцкай - 34,7, Горкаўскай - 31,8, Соламаўскай - 34,1 працэнта. Найбольш пасіўнымі праявілі сябе выбаршчыкі Купальскай выбарчай акругі - 15,6 працэнта, Пабеданоснай і Томінскай - па 18,4.

Калі арыентавацца на найбольшую колькасьць галасоў, набраных тым ці іншым кандыдатам, а гэтыя людзі, думаю, ведаюць свае дасягненьні, - дык можна даволі ўпэўнена вызначць прозьвішчы магчымых будучых дэпутатаў абласнога Савету.

Ня буду ўказваць назвы выбарчых акругаў для эканоміі газетнай плошчы, дый гэта ня так істотна. Можна лічыць, што дэпутацкі мандат зноў пакіне за сабой цяперашні дэпутат аблсавету В.А.Ражко. Яго адрыў ад бліжэйшага канкурэнта складае амаль паўтары тысячы галасоў. Адрыў у 200-300 галасоў дасягнулі ад бліжэйшых канкурэнтаў Ф.П.Паўловіч, У.К.Вайтушка, Б.М.Казялкоў, М.Я.Прысада, С.І.Васілеўскі, Т.М.Навасельцава, У.В.Сазонаў, Л.У.Школьнік, А.С.Сямёнаў, І.А.Пракопчык. З пералічаных асобаў восем балатаваліся як беспартыйныя, два - члены ПКБ.

Значная група кандыдатаў у дэпутаты абласнога Савету захоўвае неблагія шанцы. Ім, вядома, трэба добра-такі папрацаваць у сваіх выбарчых акругах. Вле маральныя затраты могуць акупіцца здабыткам мандата. Не сумняваюся, што менавіта так паступяць У.Р.Галезьнік, С.А.Жураўскі, П.П.Макараў, А.А.Высоцкі, В.Л.Шпак, І.Г.Ахметаў, А.М.Мацеша, Т.У.Ляцко, А.М.Гаркоў, С.І.Сакалоўскі, П.Ц.Рыбакоў, Л.В.Евец, А.І.Шаўчэнка, В.І.Варанец, Р.І.Можджар.

Сярод пералічаных верагодных вылучэнцаў кандыдатаў у дэпутаты чацьвёра прадстаўляюць Партыю камуністаў Беларусі, двое - Беларускі Народны Фронт, адна кандыдатка прадстаўляе жаночую партыю «Надзея». Астатнія не пазначылі сваю партыйную прыналежнасьць.

Не здабылі значных посьпехаў падчас чэрвеньскіх выбараў прадстаўнікі Партыі народнай згоды, Грамады, партыі Патрыятычнага руху. Амаль на ўсіх акругах камуністы апярэджваюць кандыдатаў ад БНФ. Але гэты разрыў уцэлым нязначны.

Калі гэты прагноз у нейкай меры спраўдзіцца, то абласны Савет новага скліканьня будзе мець уплывовыя групы акрамя дэпутатаў ад Аграрнай партыі - каля 10-13 чалавек, БНФ - 5-6 асобаў. Магчыма, будуць абраны 2-3 дэпутаты ад іншых партый і рухаў.

Верагодна, што аграрнікі і камуністы створаць адзіную дэпутацкую групу на пастаяннай, альбо на часовай платформе. Да іх далучыцца частка так званых беспартыйных - тых, хто зараз ня хоча афішаваць свае сімпатыі, але абавязкова праявіць іх пасьля абраньня. Калі не ўступленьнем у азначаныя дэпутацкія групы, то актыўнай падтрымкай пры галасаваньні.

Сярод абранай часткі аблсавету няма ні рабочых, ні сялян. Не было іх паміж кандыдатаў тых выбарчых акругаў, дзе выбары не адбыліся. Няма ветэранаў. Надзвычай мала моладзі. Вельмі бракуе юрыстаў, эканамістаў-рыначнікаў. Лічаныя адзінкі ўрачоў і настаўнікаў.

Аднак, яшчэ можна разумна папоўніць склад абласнога Савету. Але гэта цалкам залежыць ад выбаршчыкаў.

**В.ЗАДАЛЯ,**
**дэпутат абласнога Савету.**

# БЕЛАРУСІ НЕАБХОДНЫ САПРАЎДНЫЯ РЭФОРМЫ. ІНШАГА НЯ ДАДЗЕНА

**25-26 жніўня ў Горадні прайшоў семінар, прысьвечаны эканамічным рэформам у посткамуністычным грамадзтве. Ён быў наладжаны Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных дасьледаваньняў (НІСЭПД, Менск) і Цэнтрам міжнароднага прыватнага прадпрымальніцтва (CIPE, Вашынгтон) у рамках праекта «Прынцыпы свабоднай рыначнай эканомікі ў праграмах і дзейнасьці асноўных суб'ектаў палітыкі і эканомікі Беларусі».**

Распачынаючы работу семінара дырэктар НІСЭПД А.Манаеў адзначыў: «Мы ня ставім перад сабой мэту навучыць кагосьці чамусьці, выпрацаваць нейкія рэкамендацыі. Галоўная мэта такіх семінараў заключаецца ў тым, каб у рэгіёнах Беларусі даць магчымасьць сустрэцца лідарам розных партый, грамадзкіх аб'яднаньняў, прафсаюзаў, асацыяцый, бізнэсмэнам, прадстаўнікам улады, навучальных устаноў, абмеркаваць праблемы эканамічных і, часткова, палітычных рэформ на Беларусі. Галоўнае - абмен думкамі, сумеснае знаходжаньне агульных рашэньняў, магчымасьць атрымаць тую інфармацыю, якую можа даць інстытут, наладзіць дыялог між прадстаўнікамі розных партый». І такая магчымасьць была выкарыстана. На семінар былі запрошаны як прадстаўнікі БНФ, БСДГ, АДПБ, так і Аграрнай партыі, партыі камуністаў, выкладчыкі Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэта, прадстаўнікі мясцовых улад, прамысловых прадпрыемстваў, дзелавых колаў.

Найчасьцей абмеркаваньне эканамічных праблем на Беларусі ідзе на вельмі прымітыўным узроўні. Многія сьцьвярджэньні папросту не адпавядаюць рэчаіснасьці з прычыны няведаньня сутнасьці праблемы ці першакрыніцы. І менавіта на тыповыя памылкі ў дыскусіях па праблемах эканамічных рэформ зьвярнуў увагу ўдзельнікаў семінара кандыдат эканамічных навук, намесьнік дырэктара НІСЭПД І.Пеліпась. Ён адзначыў, што яшчэ ў 1993 годзе вядомы польскі эканаміст і рэфарматар Л.Бальцаровіч абагульніў найбольш тыповыя памылкі дэбатаў па праблемах эканамічных рэформ у краінах Усходняй і Цэнтральнай Эўропы. На жаль, гэтая праца ня стала вядомай як сярод сьпецыялістаў, так і сярод шырокай аўдыторыі на Беларусі.

Адным з найбольш яскравых прыкладаў зьяўляецца вельмі папулярны тэрмін «шокавая тэрапія», запазычаны эканамістамі з вобласьці псіхіятрыі, і які нясе негатыўную эмацыянальную нагрузку. Магчыма, каб вывесьці эканоміку з «сацыялістычнага абсурду», без лячэньня «шокам» не абыйсьціся, аднак персьпектыва выпрабаваць на сабе гэтую тэрапію наўрад ці можа радаваць большасьць насельніцтва.

Другім прыкладам зьяўляецца выкарыстаньне слова «сацыяльны» у самых неверагодных словазлучэньнях. На думку Ф.Хайека, яно стала "самым бесталковым выкарыстаньнем ва ўсёй нашай маральнай і палітычнай лексіцы". У гэтых адносінах вельмі паказальна выкарыстаньне тэрміна «сацыяльная рыначная эканоміка». «Сацыяльны даважак» да тэрміна «рыначная эканоміка» напэўна настолькі хвалюе ўяўленьне некаторых удзельнікаў эканамічных дыскусій, што найчасьцей даходзіць да кур'ёзаў. Паняцьце «рыначная эканоміка» само па сабе зьяўляецца дастаткова зразумелым: «сацыяльны даважак» пазбаўляе яго якога-небудзь пэўнага зьместу.

Адным з прыкладаў памылковых абагульненьняў зьяўляецца сьцьвярджэньне, што шэраг прадпрыемстваў у краінах Захаду - дзяржаўныя, але працуюць ня менш эфектыўна, чым прадпрыемствы прыватнага сектару. Але сьпіс такіх прадпрыемстваў, якія б маглі прывесьці ў якасьці аргумента праціўнікі прыватнай уласнасьці ў Беларусі, звычайна абмяжоўваецца толькі назвай французкай кампаніі «Рэно». Яшчэ адным прыкладам памылковых абагульненьняў зьяўляецца імкненьне зьвязаць усе негатыўныя зьявы (злачыннасьць, прастытуцыю, наркаманію і г.д.) з працэсам рэформ. Пры гэтым ігнаруецца тое, што невядомыя раней факты ва ўмовах свабоды праз сродкі масавай інфармацыі становяцца даступнымі шырокай аўдыторыі.

І.Пеліпась таксама засяродзіў увагу на памылках, зьвязаных з няправільнай інтэрпрэтацыяй падзей, разуменьнем паняцьця «інфляцыя», «прыватызацыя» ды іншых.

Чакалася, што ў рабоце семінара прыме ўдзел старшыня праўленьня Нацбанку Беларусі С.Багданкевіч, але гэта стала немагчымым з прычыны яго адлёту ў Вашынгтон дзеля атрыманьня краінай крэдыта «STAND BY». Замест Багданкевіча ў Горадню прыехаў яго дарадца В.Дашкевіч.

Спадар Дашкевіч спыніўся на этапах і персьпектывах эканамічнай рэформы ў Беларусі. Ён адзначыў, што за апошнія чатыры гады ў нас было прынята шмат розных праграм. Але, па яго словах, «асабліва цікавай была апошняя», якая прынята пасьля выбараў прэзідэнта. Гаворачы пра яе, ён адзначыў: «Паколькі я ўдзельнічаў у яе падрыхтоўцы, ведаю, як яна рыхтавалася. Гэта дзіўная праграма. Яна рыхтавалася сьпехам, абы як, але нічога, прыняў Вярхоўны Савет. Мы, натуральна, рэалізаваць яе не змаглі, бо праграма была разьлічаная не на гэтую ўладу. Адзіны блок, які выкананы - гэта усё, што датычылася фінансава-крэдытнай сістэмы. Бо мы ведалі, што рабіць. А праграма ўвогуле не была патрэбная. Нацбанк - адзіная самастойная арганізацыя, якая магла праводзіць сваю палітыку ў рэспубліцы. І нават прэзідэнт, калі штосьці гаворыць пра нас, дагэтуль нас не кранае. Выключэньне - адміністрацыя прэзідэнта, якая іншы раз чапляецца з недарэчнымі пытаньнямі. «Хацеў бы зьвярнуць увагу на праграмы, якія былі раней. Праграмы не ажыцьцявіліся, бо былі бессэнсоўнымі з самага пачатку».

В.Дашкевіч сказаў таксама пра магчымыя варыянты рэфармаваньня беларускай эканомікі. Першы, які асабліва блізкі «нашаму кіраўніцтву» - «кітайскі», гэта значыць паступовыя рэформы, пачынаючы, напрыклад, у сельскай гаспадарцы, затым - у сьферы паслуг і г.д. І ўсё пад кіраўніцтвам адной вялікай партыі. Кітайскі варыянт можна пакінуць у баку, бо ў нас няма такой партыі, і ўвогуле «наўрад ці гэта пройдзе».

З двух іншых варыянтаў, як лічыць В.Дашкевіч, перавагу трэба пакінуць за сацыял-дэмакратычным. Ліберальны, які прадугледжвае мінімум дзяржаўнага ўмяшальніцтва ў гаспадарчае жыцьцё, зараз практычна немагчымы. Першая прычына гэтага заключаецца ў адсутнасьці буйнога легальнага капіталу. Па-другое, адсутнічае сярэдні слой, які б мог аказаць падтрымку ліберальным рэформам, бо ў нас «грамадзтва падзялілася на дзьве часткі: тых, хто пасьпеў скапіць грошы ці зарабіць, і тых, у каго нічога няма». Пэўную падтрымку мог бы аказаць замежны капітал. І летась, па словах В.Дашкевіча, у Нацбанке было паломніцтва патэнцыяльных інвестараў: праязджалі, даведваліся, пісалі лісты. «Але потым пачыталі нашае заканадаўства і паціхеньку адыходзілі». Замежны капітал практычна не жадае ісьці на Беларусь. Правядзеньню ліберальных рэформаў перашкаджае таксама высокая доля люмпенізаванага насельніцтва. Пачаўшы іх, мы бы значна ўзмацнілі левыя рухі і любыя рэформы былі б пахаваны.

Застаецца сацыял-дэмактарычны варыянт. Ён прадугледжвае зьняцьцё кантролю дзяржавы над вытворчасьцю, але захаваньне яго ў сьферы разьмеркаваньня.

На думку В.Дашкевіча, на працягу бліжэйшых 1-1,5 галоў Беларусь павінна вызначыць сваё месца і мэты ў міжнародным падзеле працы; стварыць спрыяльныя ўмовы для разьвіцьця прыватнага сектара, выбраць напрамкі структурнай пераарыентацыі і пераўзбраеньня вытворчасьці, прыцягнуць зьнешнія і ўнутраныя інвестыцыі ў эканоміку. Акрамя таго, неабходна праводзіць прадказальную грашова-крэдытную палітыку, паскорыць чэкавую прыватызацыю дзеля пераходу да грашовай, правесьці комплекс антыкарупцыйных мерапрыемстваў і адпрацаваць адрасныя сістэмы сацыяльнай падтрымкі насельніцтва.

Дырэктар Інстытута адносін уласнасьці А.Дзягуціс (г.Вільня) прысьвяціў свой выступ "эканамічным злачынствам": механізму задушэньня рынку ў посткамуністычным грамадзтве. На яго думку, барацьба з эканамічнымі злачынствамі верціцца ў заганным коле. Спачатку заканадаўцы прымаюць законы, якія парушаюць права ўласнасьці, затым пачынаюцца «эканамічныя» злачынствы і паўстае «ценявы» сектар эканомікі. А паколькі «ценявікі» аказваюцца за межамі прававой абароны дзяржавы і грамадзкай думкі, то становяцца лёгкай здабычай злачыннага сьвету. Адзіным выйсьцем для выпраўленьня такога становішча павінна стаць неўмяшальніцтва дзяржавы ў рыначныя адносіны, абмежаваньне функцый дзяржавы, абарона ўласнасьці.

Для стварэньня і захаваньня сістэмы, заснаванай на прыватнай уласнасьці, грамадзкая думка павінна засноўвацца на прэзумпцыі «вінаватасьці» любых спроб пашырэньня дзяржаўных функцый і за кошт звужэньня правоў уласнасьці. І паколькі гэтая прэзумпцыя зацьвердзіцца ў грамадзкай сьвядомасьці посткамуністычных краін, настолькі яны прасунуцца ў сваім дабрабыце, падкрэсьліў А.Дзягуціс.

Асаблівую цікаўнасьць удзельнікаў семінара выклікаў даклад міністра працы Беларусі А.Саснова «Аб канцэпцыі рэформы аплаты працы ў Рэспубліцы Беларусь ва ўмовах рыначных адносін». Спачатку ён нагадаў пра міфы, якія датычацца сістэмы заработнай платы.

«Адзін з міфаў, які стала ўзбуджаецца ў грамадзтве, - сказаў міністр, - і ўздымаецца звычайна левымі сіламі, такі: «Я працую на дзяржаву, значыць дзяржава мне павінна заплаціць». І вельмі многія думаюць: «Мне пляваць, як называецца гэтая фірма, мне пляваць, хто там натуральны гаспадар. Я працую толькі на дзяржаву, і, калі фірма мне ня можа заплаціць, значыць дрэнная дзяржава». Гэта міф чысьцейшай вады, бо дзяржава, валодаючы дзяржаўнымі прадпрыемствамі, канешне можа адказваць па іх даўгах. Але і без таго нізкая роля папярэдняй сістэмы арганізацыі аплаты ператворыцца ў нішто. Вельмі характэрныя звароты рабочых аб тым, што яны хацелі б мець дзяржзаказ з дзяржаўнай рэалізацыяй. Гэта значыць, яны будуць выпускаць барахло, а вы яго прадайце, спадары чыноўнікі. Астатняга мы ведаць не жадаем. На гэта можна адказаць наступнае: «Добра, вы жадаеце дзяржзаказ, выпускаеце трактары? Вось вам 300 тысяч штук - вырабіце. Выдаткі ў вас - 6 тысяч долараў. За 3 тысячы пакупаем». Што яны скажуць нам у адказ? А калі мы іх па 6 тысяч возьмем, а продаж магчымы па цане 3,5? Хто будзе плаціць розьніцу?»



*Ці дачакаешся, бабуля, рэформаў?*

А.Сасноў нагадаў яшчэ аб адным міфе, узбуджаемым прафсаюзамі. Па яго словах, яны часта забываюць, што нават той пражытковы мінімум, пра які гавораць вучоныя, трэба зарабіць. Яны чамусьці думаюць, што яго хтосьці павінен даць і лічаць: «Дзяржава на тое і дзяржава, каб даць: вынь, ды пакладзі. А хто пакладзе? З чаго пакласьці?» Калі размова ідзе пра дэфіцытны бюджэт, дык там і так усё распісана. Калі размова ідзе пра тое, каб павялічыць падаткі, дык і без таго «стогнуць» ад іх. Калі размова ідзе пра тое, каб «абрабаваць лепшых на карысьць горшых, дык і так абрабавалі». Міністр лічыць: «Нават мінімальную зарплату, мізэрную, яе ніхто не абавязаны даваць, яе трэба зарабіць».

Міністр таксама спыніўся на неабходнасьці разабрацца ва ўзаемаадносінах між зарплатай, мінімальным спажывецкім бюджэтам і пражытковым мінімумам. Ён лічыць, што, магчыма, ёсьць сэнс адмовіцца ад спасылак на МСБ, бо паміж ім і мінімальнай зарплатай ніякіх функцыянальных сувязяў няма. Але на яго трэба арыентавацца пры аказаньні дапамогі бедным. А.Сасноў адзначыў таксама неабходнасьць удасканаленьня тарыфнай сістэмы, якая мае шмат сур'ёзных недахопаў. Гэта трэба зрабіць хаця б таму, што розьніца між тарыфнымі разрадамі нязначная і «мала каго і да чаго стымулюе».

Вышэйшыя кіраўнікі Беларусі ўважліва знаёмяцца з вопытам Кітая. У першым выступе перад Вярхоўным Саветам А.Лукашэнка абмаляваў жадаемую эканамічную мадэль падобную на кітайскую. Яго першым візітам у далёкае замежжа быў візіт у Кітай. Падчас знаходжаньня прэм'ер-міністра Дзяржсавету КНР Лі Пэна на Беларусь А.Лукашэнка адзначыў «агульнасьць ідэалогіі» перш за ўсё ў правядзеньні эканамічных рэформ. Высокія тэмпы эканамічнага росту ў Кітаі выкарыстоўваюцца левымі для доказу магчымасьці пасьпяховага разьвіцьця ў рамках сацыялізму. Дэідэялагізаваная бюракратыя прыкрывае вопытам нясьпешнага рэфармаваньня ў Кітаі зацягваньне рэформ. Для яе «кітайскі шлях» прывабны, бо захоўвае яе панучае становішча ў грамадзтве і забясьпечвае ператварэньне яе ў новую буржуазію.

Вопыт Кітая пацьвярджае тое, што адбылося ў іншых посткамуністычных краінах - без палітычнай рэвалюцыі эканамічныя рэформы немагчымы. Але, як і ў былым СССР, а зараз на Беларусі, бюракратыя не выпусьціла з сваіх рук ні ўладу, ні ўласнасьць. Адсюль бессістэмнасьць у правядзеньні рэформ. У выніку, ня вырашана галоўная задача - стварэньне эфектыўнай эканомікі.

Эканамічны крызіс і распад СССР былі абумоўлены нізкай эфектыўнасьцю сацыялістычнай эканомікі. Створаная ў КНР эканоміка зараз яшчэ менш эфектыўная, чым эканоміка былога СССР. Так, напрыклад легкавы аўтамабіль «Шанхай-Сантана», які на 82% зьбіраецца з дэталяў кітайскай вытворчасьці, каштуе ў Кітаі 20 тысяч долараў. Аўтамабіль такога тыпу на сусьветным каштуе 8 тысяч. Становішча Кітая да 2000 года, нават калі будзе дасягнуты ўзровень вытворчасьці, які забясьпечыць 1000 долараў ЗША ў год на душу насельніцтва (сёньня на Беларусі каля 2 тысяч), можа стаць катастрафічным.

Па ступені руху на шляху да эфектыўнай эканомікі Кітай знаходзіцца далёка ззаду ўсходнеэўрапейскіх краін і Расеі. Беларусі, якая знаходзіцца на іншым узроўні разьвіцьця, няма чаму вучыцца ў Кітая. Кітайскія рэфарматары самі адмаўляюцца ад сваёй мадэлі і пераходзяць да нармальнай рыначнай эканомікі. І калі бюракратыя па-ранейшаму будзе імкнуцца ўтрымаць у адных руках уладу і ўласнасьць, новыя ўзрушэньні непазьбежныя. Таму, аналіз досьведу і ўрокаў, назапашаных кітайскім народам на шляху рэформ, можа ўяўляць для нас інтарэс толькі адносна таго, як пазьбегнуць чужых памылак. На гэта і іншае зьвярнуў увагу ўдзельнікаў семінара ў сваім дакладзе «Аўтарытарызм і паступовасьць: ці прымальная для Беларусі «кітайская мадэль» эканамічнай рэформы?» кандыдат эканамічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік НІСЭПД Л.Злотнікаў.

Прысутныя абмеркавалі даклады навукоўцаў, выказалі свае погляды на эканамічнае становішча краіны, шляхі вываду яе з эканамічнага крызісу. Завяршаючы семінар, дырэктар НІСЭПД А.Манаеў сказаў, што дзякуючы сустрэчы, зьявілася новае веданьне і больш глыбокае разуменьне працэсу (не існуе трэцяга шляху разьвіцьця, на Беларусі няма рэформаў, а ёсьць «асобныя прарывы»; галоўная прычына гэтага ў дзяржаўнай палітыцы, хаця аб'ектыўна існуюць умовы для іх пачатку, і калі «уключыць механізм, то рэформы пойдуць»). Яшчэ адным важным вынікам семінару стала тое, што прасунуўся дыялог між рознымі структурамі і ў працэсе яго «паўстала большая цярпімасьць да думкі іншага і ствараюцца персьпектывы для іх узаемадзеяньня, а потым і да супрацоўніцтва».

**А.ДУК.**
**Фота СІМ.**

## АЙЦЕЦ ВІКТАР:

# «РАСКОЛ ХРЫСЬЦІЯНСТВА - НАШ НЕПРАХОДЗЯЧЫ БОЛЬ»

**Нядаўна з партугальскага мястэчка Фаціма, вядомага ва ўсім хрысьціянскім сьвеце, вярнуўся пасьля паломніцтва настаяцель Гарадзенскай грэка-каталіцкай суполкі а.Віктар Данілаў. Наш карэспандэнт сустрэўся з ім, папрасіўшы распавесьці пра ўражаньні ад вандроўкі і пра жыцьцё гарадзенскіх вуніятаў.**

**- Айцец Віктар, якім быў склад паломнікаў?**

- Партугалію наведала група каталіцкага духавенства агульнай колькасьцю каля 50 чалавек. Сярод іх - сьвятары лацінскага абраду Летувы, Украіны, Расеі, Казахстана. Беларусь прадстаўлялі кардынал, мітрапаліт Менскі і Магілёўскі Казімір Сьвёнтэк, грэка-каталіцкі апостальскі візітатар а.Сяргей Гаек і я. У Фаціме мы знаходзіліся тыдзень.

**- Многія людзі ў нас ня ведаюць, чым знамянальныя фацімскія падзеі.**

- Фаціма - невялічкі гарадок, калісьці вёска, у якой у 1916-1917 гг. жылі дзеці Люцыя, Францыск, Гіацынта. Яны былі непісьменнымі, але былі вельмі рэлігійнымі, дзякуючы бацькоўскаму выхаваньню. У 1916 годзе ім зьявіўся тройчы Анёл у выглядзе юнака і паведаміў, што Ісус і Марыя маюць пра іх роздум.

13 траўня 1917 года дзецям было зьяўленьне Дзевы Марыі. Божая Маці мела гутарку з Люцыяй. Марыя заклікала людзей да пакаяньня, малітвы за мір у сьвеце. Пасьля гэтага яна зьяўлялася яшчэ некалькі разоў, прадказала хуткую сьмерць Францыска і Гіацынта, паказала дзецям пекла. Дзева Марыя прадказала заканчэньне Першай сусьветнай вайны і набліжэньне Другой. Марыя зазначыла, што калі людзі ня зьменяцца да лепшага, то сьвету зноў будуць пагражаць войны. Шмат слоў было сказана пра Расею. Калі Расея (відавочна, на ўвазе меліся землі ўсяго СССР - Х.К.) не павернецца да Бога, то яна распаўсюдзіць свае адхіленьні на ўвесь сьвет, сеючы войны і ганеньні супраць царквы. Аднак на некаторы час Расея навернецца і будзе дараваны мір.

На месцы свайго зьяўленьня Марыя загадала пабудаваць капліцу і 13 кастрычніка 1917 года абяцала цуд, які павінен быў пацьвердзіць людзям Божую волю. Гэтую праяву назірала каля 60 тысячаў чалавек. Нарэшце, па просьбе Люцыі Марыя вылячыла некалькі хворых. Дарэчы, сястра Люцыя да гэтага часу жыве ў кармеліцкім кляштары (у сакавіку 1988 ёй споўнілася 88 год). Казімір Сьвёнтэк меў сустрэчу з сястрой Люцыяй і пазьней падзяліўся з намі той гутаркай. У цэлым вандроўка была вельмі насычанай. У Лісабоне мы наведалі кляштар еранімітаў, пабачылі помнік Хрысту Цару, вышынёй у 133 метры, пабывалі ў старажытных храмах XII ст. - у гарадках Батала, Алькабака, Назар. Пра свае перажываньні я падрабязна апавядаў нашым вернікам пасьля вяртаньня.

**- Грэка-каталіцкая суполка ў Горадні існуе амаль тры гады. Што зьмянілася ў яе жыцьці за гэты час?**

- Мяне ўсьцешвае рост хрысьціянскай самасьвядомасьці нашых вернікаў, усьведамленьне імі глыбокай маральнай выхаваўчай функцыі хрысьціянства. За акрэсьлены перыяд мы выйшлі на якасна новы ўзровень. Сябры нашай суполкі - пераважна людзі з вышэйшай адукацыяй, сярод іх шмат навукоўцаў. І гэта заканамерна. Бо, як сказаў адзін мудры чалавек: «Навука - гэта імкненьне да стварэньня, рэлігія - імкненьне да Тварца.» Немагчыма, каб яны супярэчылі ці супрацьстаялі адна другой.

Прыгнятае, што дагэтуль мы ня маем у вобласьці аніводнага храма і нават капліцы, без якіх немагчымы хуткі колькасны рост грэка-каталікоў. Рэлігійная свабода толькі дэкляравана. На самой справе роўнасьці паміж канфесіямі няма, бо адсутнічаюць гарантыі дзейнасьці. Мы змушаны ладзіць свае набажэнствы ў непрыстасаваных памяшканьнях. І ўсё ж у планах суполкі - стварэньне царкоўна-асьветніцкага цэнтру з бібліятэкай, катэхетычным памяшканьнем.

**- Існуе думка, што вуніяты - гэта ледзь не ультранацыяналісты.**

- Такія меркаваньні абсурдныя. Мы перш за ўсё хрысьціяне, паяднаныя ідэяй канфесійнага замірэньня і адзінства Царквы. У складзе нашае суполкі стала знаходзяцца беларусы, украінцы, палякі, расейцы, татары. Натуральна, што сярод іх многа тых, хто ангажаваны ідэяй *нацыянальнага Адраджэньня. Яны разумеюць*, што адным з гарантаў стабільнай палітычнай будучыні Беларусі зьяўляецца вуніяцтва. Таму што вуніяцтва заклікае паразумецца каталікоў з праваслаўнымі, усіх людзей, не зважаючы на іх нацыянальную прыналежнасьць і веравызнаньне.

**- З якім настроем Вы сустракаеце надыходзячыя юбілейныя ўгодкі Берасьцейскай вуніі 1596 года?**

- Раскол хрысьціянства, сваркі паміж канфесіямі - наш непраходзячы боль. Але наша вера ў адраджэньне вуніі мацуецца. Мы будзем адзначаць юбілей канферэнцыямі, сьвяточнымі набажэнствамі. Апроч гэтага ў нашых планах пілігрымкі па мясьцінах, цесна зьнітаваных з вуніяцкай гісторыяй. Верым, што Бог будзе нам спрыяць.

**Распытваў Хельмут КАМЕНСКІ.**



*Юныя мастакі*

**Фота Я.ВАНЮКЕВІЧА.**

# ЗОНА ІСНУЕ НА ПАПЕРЫ

**Як вядома, шэраг населеных пунктаў, якія знаходзяцца па суседзтву з Летувой, уключаны ў памежную зону. Але ж яна існуе пакуль толькі ўмоўна. І, хаця жадаючыя туды трапіць павінны запасьціся неабходнымі для праезду гэтага папярамі, іх наяўнасьць пры ўезьдзе на тэрыторыю зоны не правяраюць.**

Праўда, касіры на чыгуначных і аўтавакзалах не прадаюць білеты тым, хто ня мае дазволу на ўезд у памежную зону. Але кемлівыя людзі ўсё ж знайшлі выйсьце і з гэтага становішча. Яны, едучы на аўтобусах, бяруць у касе білет да населеных пунктаў, што мяжуюць з зонай, а потым набываюць у вадзіцеля яшчэ адзін да пэўнага пункта прызначэньня.

Яшчэ прасьцей трапіць на тэрыторыю памежнай зоны ўладальнікам уласнага аўтатранспарту. Садзіся - і едзь.

**Д.А.**

# ВЫВОЗЯЦЬ ЗЕРНЕ Ў РАСЕЮ

**Як паведаміў намесьнік старшыні Магілёўскага аблвыканкаму У.Адашкевіч, у вобласьці рэзка ўзрасла колькасьць прадаваемага калгасамі зерня ў Расею.**

Па яго словах, паколькі вобласьць яшчэ не разьлічылася з дзяржзаказам па зерню, міліцыі загадана затрымліваць транспарт з такім грузам і вяртаць назад. Аднак, па ацэнках сьпецыялістаў, транспартны паток у Расею не зьменшаецца, бо расейцы плоцяць за хлеб адразу і поўнасьцю, у той час, як беларуская дзяржава мае вялікую запазычанасьць перад калгасамі.

**СІМ**

# ШЛЯХУ З ВАРАГАЎ У ГРЭКІ БЫЦЬ?

**Ня так даўно кіраўніцтва Калінінградскай вышэйшай школы кіраваньня (дарэчы, даволі вядомай у бізнэсовых і палітычных колах Расеі) даслала запрашэньтне членам беларускага Ўраду наведаць Калінінградзкую вобласьць з мэтаю далейшага разьвіцьця навуковага і эканамічнага супрацоўніцтва паміж Калінінградзкім і Берасьцейскім рэгіёнамі.**

Запрашэньне было з удзячнасьцю прынятае. Дарэчы, пра навядзеньне цесных кантактаў з гэтымі самымі Прыбалтыйскімі рэгіёнамі апазіцыя ды БНФ калі яшчэ казалі...

**Л.М.**

# АДРАДЖАЕЦЦА МАНАСТЫР

**Пад час казаньня ў дзень памяці сьвятога вялікамучаніка і гайбіта Панцелеймона ў Сьвята-Троіцкай царкве Зэльвы мітрапаліт Менскі і Слуцкі Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі паведаміў, што зараз пачынае адраджацца Панцелеймонаўскі манастыр, які месьціцца на сьвятых гарах Афона, што ў Грэцыі. Ён быў заснаваны ў пачатку XI стагоддзя на сьвятым Афоне выхадцамі з Расеі.**

Зараз туды ад'ехалі 50 манахаў з Расеі і з Беларусі. Былы цэнтр праваслаўнага манастыра зноў плануе заняць адно з вядучых месцаў у выдавецкай дзейнасьці. Дарэчы, у былыя часы штогод там выходзіла каля трох тысячаў выданьняў.

**Пятро ЖЭБРАК.**

# БОЧКА З ПОРАХАМ

**Рэха югаслаўскай вайны шторазчасьцей разносіцца па цэлым сьвеце, а асабліва па Эўропе, дзе нарастае эмацыянальнае заангажаванье паасобных народаў у гэты канфлікт. Разам з агрэсіяй харватаў на заселеную сербамі Крайну, вайна набыла характар рэлігійнага каталіцка-праваслаўнага канфлікту. Хлусьлівыя каментары ў польскіх сродках масавай інфармацыі паказваюць, што Польшча выразна акрэсьліла свае пазіцыі на баку каталіцкай Харватыі.**

Калі сербы выгналі тысячу мусульман ці харватаў, такі факт быў названы варшаўскімі каментатарамі найвышэйшым злачынствам супраць чалавецтва. Сербы, дарэчы, ужо пару гадоў прадстаўляюцца як сімвал зла, проста пасланьнікі пекла. Калі аднак харваты выгналі дзьвесьце тысяч сербаў, тыя ж самыя людзі, каментуючы падзеі ў былой Югаславіі, з нескрываным задавальненьнем захапляліся бліскучай перамогай аднаверцаў. Не зьвярталі яны нават увагі на тое, што харвацкія самалёты атакавалі калоны сербскіх бежанцаў з Крайны, ні на гвалты і катаваньні жанчын і дзяцей, якія не пасьпелі ўцячы перад агрэсарамі.

Але гэта менавіта і ёсьць логіка мовы, характэрная для людзей эмацыянальна заангажаваных у канфлікт. Няма прытым ніякай этыкі журналісцкай працы, ні звычайнай чалавечай сумленнасьці.

Тым часам югаслаўская вайна пачынае шторазбольш пагражаць стабільнасьці Эўропы. Вяртаюцца як бы і старыя падзелы з пачатку нашага стагоддзя. Аказалася цяпер, што немцы і амерыканцы шмат гадоў рыхтавалі харвацкую армію да вайны з сербамі - саюзнікамі Расеі. Англічане і французы ня мелі прычын захапляцца перамогай харватаў у Крайне. Пашырэньне нямецкіх уплываў на Балканах не супадае з іх інтарэсамі. Расейскі парламант, адкідаючы аднабакова аанаўскія пастановы адносна санкцый супраць Сербіі, афіцыйна заявіў сьвету, што Расея ня будзе далей спакойна прыглядацца як слабее найвярнейшы саюзьнік. За такім ходам палітыкі выказваецца большасьць тамашняга грамадзтва.

Нягледзячы на сучасныя пакты і дагаворы, югаслаўскі канфлікт вярнуў гістарычную памяць для большасьці народаў нашага кантынента. Сімпатыі немцаў і італьянцаў накіраваліся ў бок харватаў, разам з якімі ваявалі яны падчас другой сусьветнай вайны супраць сербаў. З каментарыяў англельскай і французкай прэсы выразна відаць, што не захапляе іх перамога харватаў над сербамі з Крайны. Чым даўжэй трывае вайна ў былой Югаславіі, тым больш выразна вяртаюцца старыя палітычныя падзелы ў Эўропе. З рэлігійных прычын палякі паставілі свае сімпатыі на баку харватаў, грэкі - на баку сербаў. Але гэта толькі азначае, што старыя рэлігійныя падзелы вельмі трывалыя і выклікаюць усё яшчэ вялікія эмоцыі. Здавалася б варожасьць паміж праваслаўнымі і каталікамі ёсьць нечым іррацыянальным - усё ж і адны, і другія хрысьціяне. Кожнае хрысьціянскае веравызнаньне наказвае любіць другога чалавека, як сябе самога, забараняе нянавісьць, загадвае веруючым выбачаць крыўды нават найбольшым ворагам. Гісторыя Эўропы паказвае, што жывем на язычаскім кантыненьце. Справа Супрасьльскага манастыра ёсьць доказам, як браты-хрысьціяне шануюць сімвалы іншых хрысьціян. Можна сабе ўявіць, як гэтая пашана выглядала ў Крайне ці Заходняй Славоніі, дзе ўварваліся быццам бы хрышчаныя харваты. Ніводная царква не была патрактаваная як дом Божы, а толькі як месца дэманстрацыі нянавісьці да праваслаўных. Нішто не паказвае, што нейкая міжнацыянальная канферэнцыя паспрыяе заканчэньню гэтай балканскай вайны. Зашмат там нянавісьці, зашмат крыві пралілося і ніхто з тамашніх хрысьціян не зьбіраецца нікому выбачаць свае крыўды. Патрачаны быў час, калі існавалі адпаведныя ўмовы для дыскусіі спакойнага асуджэньня ўсялякіх крыўдаў, нанесеных падчас II сусьветнай вайны. Таму апрача ўжо існуючай праваслаўна-мусульманскай вайны, пачалася на тэрыторыі былой Югаславіі каталіцка-праваслаўная. Гэта апошняя падзея парушыла раптам палітыкаў і грамадзтва цэлай Эўропы. Балканы ўжо раз былі дэтанатарам эўрапейскай бочкі з порахам. На шчасьце для Эўропы цяпер гэтая бочка абмежаваная толькі да Югаславіі. Напэўна за Кнін, Сараева ці Баня-Луку не зьбіраюцца змагацца ні расейцы з немцамі, ні аўстрыйцы з румынамі, але шмат палітыкаў, генералаў, банкіраў і мафіозі, зацікаўленых у тым, каб вайна ў Югаславіі трывала як найдаўжэй. За іх інтарэсы доўга яшчэ плаціць будуць югаслаўскія народы.

**Яўген МІРАНОВІЧ.**

# ВЕСТКІ З ПОЛЬШЧЫ

**Набірае абароты перадвыбарчая прэзідэнцкая кампанія.**

Прэзідэнт Лех Валэнса заявіў, што з прэм'ер-міністрам Юзафам Алексым будзе мець зносіны толькі ў пісьмовай форме альбо пры сьведках, бо апошні звычайна скажае ці перакручвае словы прэзідэнта.

* * *

**Надрукаваны ліст польскіх біскупаў да выбаршчыкаў. Кіраўнікі касьцёлу заклікаюць насельніцтва прыняць актыўны ўдзел у выбарах прэзідэнта, але ні ў якім разе не галасаваць за посткамуністычных кандыдатаў, якія ў часы камуністычнага рэжыму займалі кіраўнічыя пасады ў партыйных і дзяржаўных структурах.**

На думку сьвятароў, такія людзі ня могуць праводзіць дэмакратычныя пераўтварэньні й кіраваць дзяржавай.

Дарэчы, лідар левых дэмакратаў (колішніх камуністаў) Аляксандр Квасьнеўскі лічыць, што гэта яго не датычыць.

**Ю.Г.**

ДАСЬЛЕДАВАНЬНІ

Сяргей ЁРШ

# БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РЭЗЫСТАНС У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСЬВЕТНАЙ ВАЙНЫ

## 1.УСТУП

Ужо паўстагоддзя прайшло пасьля заканчэньня другой сусьветнай вайны, але да гэтага часу ня сказана яшчэ ўся праўда пра антынямецкі супраціў на Беларусі. Дзесяткі пасьляваенных гадоў камуністычныя гісторыкі стваралі міф пра выключную ролю бальшавіцкай партыі ў кіраўніцтве антынямецкім падпольлем і партызанскім рухам, не дапускаючы аніякай рэвізіі ў гэтым пытаньні. Толькі беларускія і польскія эміграцыйныя гісторыкі ды непасрэдныя ўдзельнікі ваенных падзей, якія апынуліся на Захадзе, асьмельваліся выступаць са сваёй, не падобнай на афіцыйную, трактоўкай таго зацятага змаганьня, што ішло на абшарах нашай Бацькаўшчыны. Але яны адразу ж шальмаваліся бальшавіцкаю прапагандаю, як нямецкія калабаранты, нацыянал-фашысты, забойцы і... фантазёры. Так, калі не заставалася аргумантаў супраць іх канцэпцыяў, у ход ішло абсурднае абвінавачаньне ў фантазіраваньні...

На пачатку 1990-х г.г. на Беларусі пачалі многа пісаць пра польскае нацыянальнае падпольле й партызанку 1941-44 гадоў. Пасьля гэтага прыйшла чарга ўкраінскага нацыяналістычнага руху, які ў ваенныя часы базіраваўся на беларускім Палесьсі. Але вось пра беларускі нелегальны рух маўчалі. Юры Туронак прысьвяціў Беларускай Незалежніцкай Партыі (БНП) у сваёй кнізе «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» толькі адну балонку тэксту, ды й яшчэ падтрымоўвае версію аб сувязях партыі з абвэрам.

Найбольш цікавую й кампетэнтную характарыстыку беларускаму нацыянальнаму падпольлю дала Галіна Кнацько («Листопадовцы».Народная газета, 25 жніўня 1994 г.). Яна пісала: «Беларускі нацыянальны рух у цэлым таксама ня быў адзіным. Яшчэ ў 1940 годзе ў ім стварылася тры плыні. Адна ў барацьбе за незалежнасьць рабіла стаўку на нацыянал-сацыялістычную партыю Нямеччыны; другая, спадзеючыся лягальна атрымаць уладу, ішла на саюз з грамадзянскімі акупацыйнымі ўладамі; трэцяя аддавала перавагу нелегальнай дзейснасьці. Беларускае нацыянальнае падпольле знаходзілася ў найбольш уразьлівым стане. Нярэдка ягоныя лідары легалізаваліся, знаходзячыся на службе акупантаў, выношвалі ідэі барацьбы за назалежнасьць.

Пра ўсе гэтыя рухі і напрамкі было вядома нямецкім сьпецслужбам, якія сістэматычна наносілі ўдары або сваімі рукамі, або рукамі «супраціўнікаў, спрытна іграючы на слабасьцях і супярэчнасьцях».

Беларускіх гісторыкаў на эміграцыі было вельмі мала, а тыя, што працавалі, знаходзіліся ў розных палітычных лагерах. З гэтай прычыны яны ў сваіх дасьледаваньнях адлюстроўвалі, перш за ўсё, інтарэсы той палітычнай групоўкі, да якой належалі. Таму было шмат суб'ектыўнасьці, замоўчваліся адныя эпізоды й празьмерна ўсхваляліся іншыя... Сапраўды, нелегальны рух быў неаднародным і гэтая неаднароднасьць (упрост да варожасьці) была перанесеная ў эміграцыю. Яскрава характэрызуе гэта дачыненьні Рады БНР і хмараўскай Грамады. Рада БНР усяляк папулярызавала Беларускую Незалежніцкую Партыю, але ні словам не ўспамінала пра нелегальную Грамаду і Беларускую Народную Партызанку. Хмараўцы ж, наадварот, усяляк расхвальвалі сваё падпольле й партызанку, а БНП абвінавачвалі ў сувязях з абвэрам (атрымоўвалася, што толькі Грамада была паўнацэннай нелегальнай арганізацыяй). У выніку, за 50 гадоў на эміграцыі так і не было зроблена дасьледаваньня, у якім прысутнічалі б усе дзейнікі нацыянальнага рэзыстансу, а не асобныя партыі й групы. Дарэчы, гэткая ж сітуацыя была й ва ўкраінскай эміграцыі. У выдадзеных у Канадзе двух тамах «Летапісу УПА» замоўчваецца дзейнасьць ОУН палк. Мельніка й Палескай Сечы УПА ат.М.Бараўца (Тарас Бульба). З беларускіх эміграцыйных гісторыкаў, у справе вывучэньня нацыянальнага рэзыстансу, найбольш зрабілі Юрка Стасевіч (Грамада) і Вацлаў Пануцэвіч (Бэнээравец). Першы друкаваў свае работы ў газеце «Беларускі голас» (Таронта), а другі - у часопісе «Беларуская Царква» (Чыкага). Паміж імі ішла палеміка, да якой падключаліся й камуністы. Менскі «Голас Радзімы» й канадзкія пракамуністычныя (кадэбісцкія) газеты асабліва зацята наскоквалі ў сваіх «разоблачениях» на хмараўцаў, бо тыя пад час нямецкай акупацыі, сапраўды, зрабілі ці не найбольш для незалежнасьці Беларусі, чымсьці іншыя арганізацыі. Адна толькі Беларуская Народная Партызанка не давала спакою і камуністычным ідэолагам і кадэбісцкім кіраўнікам.

Сёньня мы паспрабуем стварыць агульную карціну дзейнасьці нацыянальных падпольных арганізацыяў і партызанскіх аддзелаў у змаганьні за незалежную Беларускую Народную Рэспубліку.

## 2. КСЁНДЗ ВІНЦЭНТ ГАДЛЕЎСКІ - КІРАЎНІК І ІДЭОЛАГ БЕЛАРУСКАГА ВЫЗВОЛЬНАГА РУХУ

У міжваенным часе найбольш пасьлядоўным правадніком незалежніцкіх ідэй у беларускім вызвольным руху быў кс. В.Гадлеўскі. Ён ня толькі гуртаваў вакол сябе беларускіх нацыяналістых-незалежнікаў, але й распрацоўваў ідэалогію руху. Другою асобаю гэткага маштабу й незалежніцкай ідэалогіі быў былы кіраўнік Беларускай партыі сацыялістых-рэвалюцыянераў Тамаш Грыб, але ён памёр у 1938 г. ў чэшскай Празе.

У той час, калі беларускія дзеячы «хісталіся» ад паланафільства да камунізму й нават фашызму, кс. Гадлеўскі праводзіў строга незалежніцкую палітыку. Калі ў 1936 г. Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя на чале з кс. Адамам Станкевічам пайшла на паваду камуністых, далучыўшыся да акцыі антыфашыстоўскага народнага фронту, перайменаваўшы БХД на Беларускае Народнае Аб'яднаньне, кс. Вінцэнт Гадлеўскі арганізоўвае сваю незалежніцкую групу пад назовам «Беларускі Фронт» і выдае газету пад гэткаю ж назваю. Сябры ягонае групы (Мікола Шкялёнак, Мікола Шчорс і інш.) у гады другой сусьветнай вайны прынялі актыўны ўдзел у арганізацыі Беларускага Антыгітлераўскага Рэзыстансу.

Пачатак другой сусьветнай вайны актывізаваў дзейнасьць групы кс. Гадлеўскага. Правадыр беларускіх незалежнікаў разумеў, што гісторыя дае яшчэ адзін шанц для адбудовы незалежнае Беларускае дзяржаўнасьці й яго трэба скарыстаць. Напрыканцы 1939 г. ў Вільні была заснаваная кс. Гадлеўскім Беларуская Незалежніцкая Партыя, у кіраўніцтва якой уваходзілі таксама і Станіслаў Грынкевіч (старэйшы), Чэслаў Ханяўскі, М.Шкялёнак і інш. У 1940 г. кіраўніцтва партыі перабіраецца ў акупаваную немцамі Польшчу, дзе распачынае актыўную арганізацыйную працу. Ксёндз Гадлеўскі піша праграму БНП, як нелегальнай арганізацыі, якая змагалася за незалежную Беларускую Дзяржаву.

Адначасна кс. В.Гадлеўскі дзейнічае афіцыйна, як кіраўнік нацыяналістычнай арганізацыі «Беларускі Народны Фронт» (БНФ), праграму якой выдае ў Варшаве й распаўсюджвае сярод беларусаў Нямеччыны, Чэхаславаччыны, Генеральнай губерні й Францыі. БНФ зьяўляецца легальным прыкрыцьцём падпольных структураў БНП. У гэты час групы партыі дзейнічалі ў Польшчы (М.Шчорс, кс.Пётр Татарыновіч, Вітаўт Тумаш, Ч.Ханяўка, Мікола Ждановіч, Барыс Стрэльчак, Пётр Ластаўка, Баляслаў Манкевіч і інш)., у Нямеччыне (М. Шкялёнак, Мікола Абрамчык, Анатоль Шкутка, Станіслаў Грынкевіч (малодшы) і інш.), у Францыі (Лявон Рыдлеўскі й Абрамчык да выязду ў Берлін), у Рыме (Часлаў Сіповіч), у Празе (Васіль Захарка). Беларускія вайскоўцы з польскага войска, вызваленыя немцамі з лагераў для ваеннапалонных, далучаюцца да канспіратыўнай БНП (Усевалад Родзька, Міхаіл Вітушка, Рыгор Зыбайла й інш.).

Напярэдадні нямецка-савецкай вайны, 19 чэрвеня 1941 г. ў Берліне быў утвораны Беларускі Нацыянальны цэнтр на чале з М.Шчорсам, як правобраз будучага Беларускага Ураду. Яшчэ заставаліся спадзяваньні, што немцы будуць спрыяць адраджэньню беларускае дзяржаўнасьці. Але гэтыя ілюзіі зьніклі хутка пасьля пачатку вайны.

## 3. АРГАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА РЭЗЫСТАНСУ

Падпольная барацьба заўсёды мае шмат заблытаных і цяжка зразумелых балонак. Невялікая колькасьць захаваўшыхся архіўных дакумантаў і ўспамінаў нямногіх жывых сьведак тых падзеяў не здымаюць усе пытаньні. У большай ступені гэта датычыць беларускага нацыянальнага рэзыстансу.

Глыбокая канспірацыя прыводзіла да такіх сітуацый, калі некаторыя сябры падпольля ня ведалі, у якой яны былі арганізацыі. Напрыклад, Іван Касяк ужо на эміграцыі пісаў у адным выпадку, што ён быў сябрам БНП, у другім - сябрам Партыі Беларускіх Нацыяналістых (ПБН). Былі выпадкі, калі некаторыя дзеячы мелі падвойнае сяброўства ў падпольных арганізацыях. Так, кіраўнік нелегальнай Грамады Юльян Саковіч быў сябрам ЦК БНП, а старшыня ЦК ПБН Ян Станкевіч, па некаторых зьвестках, быў і актыўным сябрам БНП. Вацлаў Іваноўскі, адзін з кіраўнікоў БПН, па зьвестках І.Касяка, у 1942 г. увайшоў у ПБН, што выклікала пратэст Саковіча і Касяка («Заўвагі да артыкулу аб Іваноўскім», Беларуская думка (ЗША), N 29, 1984 г.)

## ПАРТЫЯ БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТЫХ

Дзейнасьць гэтай падпольнай арганізацыі дасканала вывучыў Ю.Туронак. У сваіх дасьледаваньнях (Беларуская праблема ў палітыцы лонданскага лагера; Беларусь пад нямецкай акупацыяй; В.Іваноўскі і адраджэньне Беларусі) ён адстойвае думку, што ПБН была адзінай праўдзівай канспіратыўнай арганізацыяй.

ПБН была ідэяю Я.Станкевіча і В.Іваноўскага, якія арыентаваліся на заходніх саюзьнікаў і іх вырашальную ролю ў арганізацыі пасьляваеннага ладу ў Эўропе. Арганізацыяй структураў партыі Ян Станкевіч займаўся ў 1940-41 г.г. у акупаванай немцамі Варшаве «з апазіцыйна настроеных да палітыкі Шчорса і Гадлеўскага сяброў варшаўскага Беларускага камітэта». У склад ПБН увайшлі й разьведчыкі польскага падпольля (Дабжыньска, Кастравіцкі, Буткевіч).

Станкевіч спрабаваў выйсьці на заходніх саюзьнікаў праз польскае падпольле, але тое адмаўлялася весьці перамовы з нешматлікай ПБН. Толькі ў лістападзе 1941 г., калі Іваноўскі стаў бурмістрам Менску, палякі ўбачылі якія магчымасьці для падпольнай дзейнасьці дае супрацоўніцтва з групай Станкевіча. Пачаліся перамовы, якія, аднак, ні да якіх вынікаў не прыводзілі.

Паводле ліпеньскага акоўскага рапарту 1942 г. ПБН налічвала 500 чалавек. ЦК партыі складаўся з 12 чалавек (8 заходнікаў, 4 усходнікаў (нацдэмаў), і яго ўзначальваў Станкевіч. Партыя будавалася з «пяцюрак», якія былі ў большасьці раёнаў генеральнага камісарыяту.

## ГРАМАДА

Восеньню 1941 г. з ініцыятывы каманданта беларускай паліцыі Менскай акругі Юльяна Саковіча паўстала нелегальная Грамада. Гэта была падпольная арганізацыя былых сяброў беларускай сялянска-работніцкай грамады. Сам Саковіч, аграном па адукацыі, у маладосьці сімпатызаваў камунізму, шмат гадоў праседзеў у польскіх турмах за палітычную дзейнасьць. Перад вайной быў арыштаваны НКУС, але выжыў і, разьвітаўшыся з камуністычнымі ілюзіямі, пачаў актыўна дзеіць на пачатку нямецкай акупацыі.

Выкарыстаўшы нібы інструктаж працаўнікоў беларускай Народнай Самапомачы, Саковіч склікаў у Менску былых грамадоўцаў для ўзнаўленьня арганізацыі. На нарадзе было 9 чалавек (Саковіч, Сяргей Хмара (Сіняк), Васіль Лукашык, Іван Гелда, Васіль Пінскі (Вір), Юрка Стасевіч і іншыя). Было пастаноўлена дзейнасьць арганізацыі строга канспіраваць. Грамада будавалася з «троек» і непасьведчаных ува ўсё прпыхільнікаў. Спрэчка ўзьнікла толькі ў пытаньні супрацоўніцтва з нямецкаю грамадзянскаю адміністрацыяю. Было вырашана да наступнай канферэнцыі (яна адбылася напрыканцы 1942 г.) пакінуць гэтую справу адкрытай на адказнасьць паасобных сяброў.

Грамада мела сваю сувязную сетку па ўсёй Заходняй Беларусі, пачынаючы Менскам, Пінскам; Берасьцем, Беластокам і Вільняю, аднак не налічвала больш 50 дзейных сяброў (па-за партызанскімі аддзеламі). Выканаўчая «Пятка» Грамады складалася з Саковіча, Хмары, атамана Якуба Харэўскага, Віра і атамана Язэпа Таўпекі.

Неабходна адзначыць, што савецкія сьпецслужбы нейкім чынам выйшлі на Грамаду, але яны памылкова вызначылі кіраўнікоў арганізацыі. А.Салаўёў піша пра «руководителя «Белорусской Громады» Фабиана Акинчица» і «руководителя «белорусской народной громады» Владислава Козловского» (Они действовали под разными псевдонимами. Мн.,1994). Але ні Акінчыц, ні Казлоўскі ня мелі з Грамадою аніякіх кантактаў, бо да іх, як нацыянал-сацыялістых, беларуская канспірацыя ня мела даверу.

## БЕЛАРУСКАЯ НЕЗАЛЕЖНІЦКАЯ ПАРТЫЯ

З пачаткам нямецка-савецкай вайны на Беларусь прыбылі з Варшавы сябры БНП для працы ў грамадзянскай адміністрацыі. Да іх далучыліся жаўнеры Першага Штурмовага Зьвязу - аддзела дэсантнікаў, арганізаванага ў Польшчы з ініцыятывы кс.Гадлеўскага, скінутага ў БССР перад пачаткам вайны. На Беларусі наладжвалася канспіратыўная сетка БНП. У шэрагі партыі ўліліся былыя вязьні савецкіх турмаў (Юльян Саковіч, Барыс Рагуля, Лявон Савёнак, Антон Шукелойць і інш.)

У жніўні (або верасьні) 1941 г. у Варшаве адбыўся зьезд партыі, на якім кс.В.Гадлеўскі прапанаваў праект праграмы канспіратыўнай працы. Праект гэты быў прыняты й былі толькі спрэчкі адносна кандыдата на выезд за мяжу. У Лондан павінны былі ехаць кс.Гадлеўскі і М.Абрамчык. Але кс.Гадлеўскі палічыў свой выезд перадчасным. У Швэцыю праз Нарвегію паехаў удзельнік Першага Штурмовага Зьвязу Альберт Асоўскі, які зьвязаўся з беларускай эміграцыяй у ЗША.

У сярэдзіне верасьня 1941 г. Усевалад Родзька арганізоўвае падпольле БНП у Менску. Былыя вязьні бальшавіцкіх турмаў успрымалі яго, як галоўнага арганізатара партыі. Родзька ж правадырства ў БНП кс.Гадлеўскага не раскрываў.

Існавалі й меншыя арганізацыі й групы, якія гінулі, або ўліваліся ў большыя партыі. Газета «Бацькаўшчына» пісала 18 красавіка 1948 г.: «...за часамі нямецкай акупацыі ў падзямельлі йснавалі, дзеялі, змагаліся й несьлі ахвяры й іншыя, таксама незалежніцкія партыйныя арганізацыі, а не адна толькі БНП». Міхась Зуй успамінаў, што восеньню 1941 г. да яго прыехаў з Глыбокага былы студэнт Львоўскай палітэхнікі Аўген Аскерка й прапанаваў далучыцца да тайнай арганізацыі беларускіх патрыётаў для барацьбы з польскімі шавіністамі. Што гэта была за арганізацыя - няведама.

**(Пацяг у наступным нумары)**

# праграма тэлерадач

## Панядзелак 4 верасьня

### Белорусское телевидение

**17.00** Телевидение - школе. Белорусская литература. Песня -душа народа. **17.30** «Все обо всем».Информационно-познавательная программа для детей. **17.50** Мультфильм. **18.00** АТН (с сурдопереводом), Би-би-си, Си-эн-эн. **18.45** Телеанонс. **18.50** Музыкальный антракт. **19.00** «На добрый лад». Передача из Гомеля. **19.20** Пресс-импреза. Экономическое будущее Беларуси. Прямая линия. **20.00** Протокол. Международная программа. **20.20** Спортивный телекурьер. **20.40** Колыбельная. **21.00** Новости. **21.30** Музыкальный антракт. **21.45** Вертикаль. Почта Президента. **22.15** Белорусский дом. Художественно-публицистическая программа. **22.55** Под куполом Вселенной. **23.00** Новости. **23.15** «Не сошлись характерами...» Худ. фильм. **Гродно: 18.10** Крим-стоп **18.40** Дневник Принеманья.

### 1 канал

**5.00** Телеутро **8.00 11.00 14.00 23.35** Новости **8.20 17.20** «Тропиканка» **9.10** Поле чудес **10.00** Человек и закон **12.00** «Место встречи изменить нельзя», х.ф. с.**1 13.05 15.00** Мультфильмы **13.20** Иванов, Петров, Сидоров... **14.20** Сем дней спорта **15.25** Звёздный час **16.05** «Элен и ребята» **16.30** Тет-атет **17.00 20.00** Время **17.10** Час-пик **18.35** Угадай мелодию **19.00** Мы **19.45** Спокойной ночи, малыши! **20.55** Встреча с Солженицыным **21.10** «Гиганты второй мировой» **22.05** Версии **22.25** Футбольное обозрение **22.55** «Загадки истории»

### Канал «Россия»

**6.30** Время деловых людей. **7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00** Вести. **7.30** Звезды говорят. **7.35** Ритмика. **7.50** Требуются... требуются... **7.55** «Желтый пес». Худ. фильм (Франция). **9.15** Клип-антракт. Линда. **9.25** «Личная жизнь». Док. фильм. **10.05** Милицейская хроника. **10.15** Телегазета. **10.20** Мульти-пульти. «Филипок», «Черная курица». **10.50** «Братья Третьяковы». Док. фильм. **11.10** Клип-антракт. Л.Агутин. **11.15** Новая линия. **15.05** Там-там новости. **15.20** Праздник каждый день. **15.30** Мульти-пульти. **16.20** Новая линия. «Наука сегодня». **16.50** «Моя война». А.Иващенко. **17.20** Купить-не купить. **17.30** Спасение **911**. **18.25** Устами младенца. **19.25** Подробности. **19.35** «Обманный удар». Худ. фильм сериала «Инспектор Морс» (Великобритания). Часть **2**-я. **20.40** Репортер. **21.00** Момент истины. **21.50** Клип-антракт. С.Лазарева. **22.30** Река времени. **22.35** Автомиг. **22.40** «Берлин, Александрплатц». Худ. фильм (ФРГ). **3**-я серия.

### Санкт-Петербург

**12.00, 14.30, 18.30, 21.40** Информ ТВ. **12.25** «Три такта». Музыкальный фильм. **13.00** Скорая помощь. **13.30** «Мануэла». Худ.фильм. **14.15** Советы садоводам. **14.40, 17.05, 19.55** Музыкальный момент. **14.45** Наше кино. «Нелюдь, или В раю запрещена охота». **17.10** «Новая Южная Африка». Док.фильм. **17.20** К **775**-летию А.Невского. **17.30** Сказка за сказкой. **18.00** Телемагазин, **18.05** Телеблиц. **18.10** Большой фестиваль. **18.50** Спортивные новости. **18.55** «Мануэла». Худ.фильм. **19.45** Телеслужба безопасности. **20.00** Д.Н.Мамин-Сибиряк.»Под липой». Видеофильм. **21.20** Дела городские. **21.55** Спорт, спорт, спорт... **22.15** «Телекомпакт». Музыкальное шоу.

### Польша - 1

**07 00** Кофе или чай? **08 45** Беседа. **09 00** ""Мода на успех''. Сериал пр-ва США. **09 30** Братство игр и приключений. **10 00** Новости. **10 10** Мама и я. **10 25** Дошкольники дома. **10 50** Гимнастика. **10 55** Поговорим о детях. **11 05** ""Доктор Квинн''. Сериал пр-ва США. **11 45** Музыкальная программа. **12 00** Приятное с полезным. **12 30** Мир людей. **13 00** Новости. **13 10** Агробизнес. **13 15** Все о фирме. **13 40** Охотники за тайнами. **13 50** Бомбардировщики. **14 20** Сила традиции. **14 35** Варшава. **15 00** Пятно. **15 15** Энциклопедия второй мировой войны. **15 35** Тайная история СССР. **15 50** Программа на вечер. **16 00** Концерт. **16 30** ""Мода на успех''. Сериал пр-ва США. **17 00** Программа для подростков. **17 25** Программа для детей. **18 00** Телеэкспресс. **18 20** Публицистическая программа. **19 10** ""Марфи Браун''. Сериал пр-ва США. **19 35** Юбилейная программа. **20 00** Вечеринка. **20 30** Новости. **21 10** Телетеатр. **22 05** Документальный фильм. **22 30** Пульс дня. **22 45** Неделя президента. **23 00** Тележурнал. **23 30** Военный журнал. **00 00** Новости. **00 20** ""Сильный мужчина''. Фильм пр-ва США. **02 15** Развлекательная программа.

### Польша - 2

**08 00** Панорама. **08 10** Спортивная программа. **08 20** Утреннний гость. **08 50** Академия здоровья. **09 00** Местная программа. **09 30** ""Морк и Минди''. Сериал пр-ва США. **10 00** Сатирическая программа. **11 00** Велосипедное братство. **11 25** Мультсериал. **11 30** Телетурнир. **12 00** Телесериал. **12 50** Музыкальное лето. **13 50** Академия здоровья. **14 00** Панорама. **16 00** Приветствие. **16 05** Мультфильм. **16 30** Тележурнал. **17 00** Документальный фильм. **17 20** Тени жизни. **17 30** Футбольный журнал. **18 00** ""Домик над озером''. Сериал пр-ва Германии. **19 00** Панорама. **19 10** Местная программа. **20 00** Колесо фортуны. **20 35** Велосипедное братство. **21 00** ""Алло, Алло''. Сериал пр-ва Анлглии. **21 35** Автожурнал. **22 00** Панорама. **22 35** ""Эмилия''. Сериал пр-ва Канады. **23 20** Химера. **00 00** Документальный фильм. **01 00** Панорама. **01 05** Фестиваль.

## Аўторак, 5 верасьня

### Белорусское телевидение

**7.35** Утренний коктейль. **7.50** Зеркало Си-эн-эн. **8.05** Авто-парк. **8.20** Бездельник. **8.40** Финансовое время. **9.00** Телевидение - школе. Белорусская литература. Песня - душа народа. **9.30** Мультфильмы. **10.00** «Белый слон». Худ. фильм. **11.20** Туробъектив. Путешествия, встречи, отдых. **11.40** Компьютерный полигон. **12.05** «Птичья осень», «Чернохвостая чайка». Док. фильмы. **12.30** «Голосом моим...» Фильм-концерт. **13.30** «Петровка, **38**». Худ. фильм. **15.00** Новости. **15.10** По вашим просьбам. «ТАСС уполномочен заявить». Худ. фильм. **1**-я серия. **16.20** Телевидение - школе. Белорусская литература. Строки, опаленные войной. Военная поэзия Аркадия Кулешова. **16.50** «Живые струны». Фильм-концерт. **17.25** Уроки Н.Новожиловой. **18.00** АТН (с сурдопереводом), Би-би-си, Си-эн-эн. **18.45** SOS. **18.50** Музыкальный антракт. **19.00** Конкурент. Белорусские автомобили. **19.40** Портрет в интерьере. Врач Галина Харкевич. **19.55** «Лада ОМС» представляет: «Моя любовь, моя печаль». Телесериал. **20.25** Экономикст. **20.35** Скрижали. Неру. **20.40** Колыбельная. **21.00** Новости. **21.30** Музыкальный антракт. **21.45** «След маньяка. Светлогорская трагедия». Часть **1**-я. **22.05** Студия «Палитика». **22.20** «Мятежный духом». Телесериал. В перерыве **(23.00)** -Новости. **23.30** Под куполом Вселенной. **23.35** «Ночной этюд». Передача из Витебска. **23.50** Конный спорт. Этап Кубка мира «Вольво». **Гродно: 17.25** Радар **18.10** Круг мыслей **18.40** Дневник Принеманья **19.10** Далек ли выход из кризиса **21.30** Дилижанс.

### 1 канал

**5.00** Телеутро **8.00 11.00 14.00 23.35** *Новости* ***8.20 17.20*** *«Тропиканка»* ***9.10*** Мы **9.50** Смехопанорама **10.35** Огород круглый год **11.20** ТРК «Мир» **12.00** «Место встречи изменить нельзя», с.**2 13.10** Мультфилм **13.20** Иванов, Петров, Сидоров... **14.20** Футбольное обозрение **15.00** Посмотри, послушай **15. 20** Кактус и Ко **15.30** Квартет «Весёлая компания» **17.00 20.00** Время **18.10** Час-пик **18.35** Угадай мелодию **19.00** Тема **19.45** Спокойной ночи, малыши! **20.55** Из первых рук **21.10** «Простая история», х/ф **22.45** Версии **23.00** Кабаре «Все звёзды»

### Канал «Россия»

**6.30** Время деловых людей. **7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00** Вести. **7.30** Звезды говорят. **7.35** Ритмика. **7.50** Требуются... требуются... **9.55** Телегазета. **10.05** Милицейская хроника. **10.15** «Арсений Тарковский». Вспоминает К.Ваншенкин. **10.40** Клип-антракт. М.Шуфутинский. **10.45** «Камень сновидений». Мультсериал (Великобритания). **11.15** Новая линия. **15.05** Студия «Рост». Кинофестиваль в «Артеке». **15.50** Месяцеслов. **16.20** Новая линия.»Нить Ариадны». **16.50** «Камень сновидений». Мультсериал (Великобритания). **17.20** Никто не забыт. **17.25** Теледебаты. **18.10** L-клуб. **19.25** Подробности. **19.35** «Приглашение». Худ. фильм (Швейцария). **21.30** Танц-экспресс. **21.45** Экран криминальных сообщений. **22.30** Река времени. **22.35** Автомиг. **22.40** «Берлин, Александрплатц». Худ. фильм (ФРГ). **4**-я серия.

### Санкт-Петербург

**12.00, 14.30, 18.30, 21.40** Информ ТВ. **12.25** Мультфильмы. **12.50, 14.40, 19.50** Музыкальный момент. **13.00** Скорая помощь. **13.30** «Мануэла». Худ.фильм. **14.10** Советы садоводам. **14.45** «Пэпо». Худ. фильм. **16.15** «И хлеб, и песня». Телефильм. **16.45** Россия в центре Женевы. **17.05** По всей России. **17.15** Сказка за сказкой. **18.00** Телемагазин. **18.05** Телеблиц. **18.10** Большой фестиваль. **18.50** Спортивные новости. **18.55** «Мануэла». Худ.фильм. **19.40** Телеслужба безопасности. **20.00** Хочешь? Смотри... Юмористическая программа. **20.40** «На бис». Группа «Аквариум». **21.55** Спорт, спорт, спорт... **22.15** «Все о Еве». Спектакль. **1**-я серия.

### Польша - 1

**07 00** Кофе или чай? **08 45** Беседа. **09 00** "Летающий Киви''. Сериал для молодежи. **09 30** Телетурнир. **10 00** Новости. **10 10** Мама и я. **10 25** Дошкольники дома. **10 50** Гимнастика. **10 55** Поговорим о детях. **11 00** "Джулия Джокер''. Сериал пр-ва Германии. **11 50** Музыкальная программа. **12 00** Рынок труда. **12 20** Плавать может каждый. **12 30** Клуб одиноких сердец. **12 50** Сто лет. **13 00** Новости. **13 10** Агробизнес. **13 15** Сельскохозяйственная программа. **13 45** Компьютерная школа. **14 00** Фантастические повести. **14 15** Великие открытия в науке и технике. **14 30** Кухня. **14 45** Атом, звезды, жизнь. **15 05** Счет математики. **15 20** Документальный фильм. **15 50** Программа на вечер. **16 00** Музыкальная программа. **16 30** "Новые приключения Черного князя''. Сериал для молодежи. **17 00** Журнал харцеров. **17 25** Тик-так. **18 00** Телеэкспресс. **18 20** Лицом к лицу. **19 00** Мультсериал. **19 30** Сенсация XX века. **20 00** Вечеринка. **20 30** Новости. **21 10** "Молчание сердца''. Фильм пр-ва США. **22 45** Пульс дня. **23 05** Сеймограф. **23 15** Письма о хояйстве. **00 00** Новости. **00 15** Документальный фильм. **01 10** Богово и кесарево. **01 35** Клуб одиноких сердец. **02 55** Развлекательна программа.

### Польша - 2

**08 00** Панорама. **08 10** Спортивная программа. **08 20** Утренний гость. **08 50** Академия здоровья. **09 00** Местная программа. **09 30** ""Радиороманс''. Сериал пр-ва Польши. **10 00** Сатирическая программа. **10 30** Сокровища азиатской культуры. **11 30** Телетурнир. **12 00** ""Запретная любовь''. Сериал пр-ва Испании. **12 50** Музыкальное лето. **13 50** Академия здоровья. **14 00** Панорама. **14 20** ""Семья''. Сериал пр-ва Новой Зеландии. **16 00** Приветствие. **16 05** Мультсериал. **16 30** Спортивная студия. **17 00** Тележурнал. **17 10** Католическая программа. **17 30** Телетурнир. **18 00** ""Домик над озером''. Сериал пр-ва Германии. **19 00** Панорама. **19 10** Местная программа. **20 00** Телетурнир. **20 35** Программа для детей. **21 00** Это правда? **21 20** Документальный фильм. **21 50** Спортивная программа. **22 00** Панорама. **22 35** Экологическая программа. **22 45** Репортеры представляют. **23 05** Художественный фильм. **00 30** Тележурнал. **01 00** Панорама.

## Серада, 6 верасьня

### Белорусское телевидение

**7.35** Утренний коктейль. **7.50** Экономикст. **8.00** Зеркало Си-эн-эн. **8.15** «Лада ОМС» представляет: «Моя любовь, моя печаль». Телесериал. **8.45** «Охота в чужом краю». Док. фильм. **9.00** Телевидение - школе. Белорусская литература. Строки, опаленные войной. Военная поэзия Аркадия Кулешова. **9.30** «Мятежный духом». Телесериал. **10.25** Мультфильмы. **10.55** «Поехал поезд в Бульзибар». Худ. фильм. **12.00** Видимо-невидимо. **13.00** «Журавли». Док. фильм. **13.30** «Огарева, **6**». Худ. фильм. **15.00** Новости. **15.10** «ТАСС уполномочен заявить». Худ. фильм. **2**-я серия. **16.20** «Про бурого медведя», «Планета не только людей». Док. фильмы. **17.05** «Незнакомая песня». Короткометражный худ. фильм. **17.35** Варианты. Приватизация на Украине. **18.00** АТН (с сурдопереводом), Би-би-си, Си-эн-эн. **18.45** Телеанонс. **18.50** Музыкальный антракт. **19.00** Экономикст. **19.10** «Чистый голос». Музыкальная программа. **19.40** Колыбельная. **20.00** Новости. **20.30** Музыкальный антракт. **20.45** «След маньяка. Светлогорская трагедия». Часть **2**-я. **21.05** Футбол. Отборочный матч чемпионата Европы. Сборная Голландии - сборная Беларуси. Трансляция из Голландии. **23.15** Новости. **23.30** Под куполом Вселенной. **23.35** «Возвращение «Святого Луки». Худ. фильм. **Гродно: 18.10** Слово. Художественная пр-ма.**18.50** Дневник Принеманья.

### 1 канал

**5.00** Телеутро **8.00 11.00 14.00 23.35** Новости **8.20 17.20** «Тропиканка» **9.10** Тема **9.50** В мире животных **10.30 13.05** Мультфильмы **10.35** Пойми меня **11.20** ТРК «Мир» **12.00** *«Место встречи изменить нельзя»*, с.**3 13.20** Иванов, Петров, Сидоров... **14.20** Семь дней спорта... **15.00** Домисолька **15.20** Както раз **15.30** Круголя **16.05** «Элен и ребята» **16.30** Тин-тоник **17.00 20.00** Время **18.10** Час-пик **18.35** Угадай мелодию **19.00** Песня-**95 19.45** Спокойной ночи, малыши! **20.55** Футбол. **22.45** Версии **23.00** Магик-шоу

### Канал «Россия»

**7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00** Вести. **7.25** Звезды говорят. **7.30** Ритмика. **7.45** Требуются... требуются... **7.50** Клип-антракт. Н.Ветлицкая. **7.55** Ключевой момент. **8.05** Пилигрим. Российское бюро путешествий. **8.50** Р.Вагнер. Увертюра к опере «Тангейзер». **9.05** «Сталинградские мадонны». Док. фильм. **9.40** Крестьянский вопрос. **10.05** Телегазета. **10.10** XX век в кадре и за кадром. **11.15** Новая линия. **15.05** Там-там новости. **15.20** Праздник каждый день. **15.30** Чья сторона? **16.20** Новая линия. Дальний Восток. **16.50** «Иван и Митрофан»,»Чехарда». Мультфильмы. **17.15** «Россия. Объяснение в любви». Премьера художественно-публицистического цикла. **17.45** Я-лидер **18.10** Вас приглашает фирма «Савва». **18.25** Своя игра. **19.25** Подробности. **19.35** «Санта-Барбара». Худ.фильм. **20.30** Домино Михаила Боярского. **21.05** Тихий дом. **22.30** Река времени. **22.35** Автомиг. **22.40** «Здесь кто-то был», «Вальтер и Амалия». Короткометражные худ. фильмы.

### Санкт-Петербург

**12.00, 14.30, 18.30, 21.40** Информ ТВ. **12.25** Мультфильм. **12.35** «М. Глинка. Романсы. Исполняет А.Ведерников». Телефильм. **13.00** Скорая помощь. **13.30** «Мануэла». Худ.фильм. **14.15** Советы садоводам. **14.40, 16.05, 21.30** Музыкальный момент. **14.45** Д.Н.Мамин-Сибиряк «Под липой». Видеофильм. **16.10** «Замочек с секретом». Мультфильм. **16.30** Самые маленькие звездочки. **17.00** Баскетбол. Чемпионат России. Суперлига. «Спартак» (Санкт-Петербург) - «Динамо» (Москва). **17.40** К **775**-летию А.Невского. **17.50** Баскетбол. Чемпионат России. Суперлига.»Спартак»(Санкт-Петербург) - «Динамо» (Москва). **18.50** Большой фестиваль. **19.05** Телемагазин. **19.10** «Мануэла». Худ.фильм. **20.00** Телеслужба безопасности. **20.10** «Хорошее настроение». Музыкальный фильм. **20.40** Блеф-клуб. **21.15** «Песни нашей памяти». Вениамин Баснер. Передача **1**-я. **21.55** Спорт, спорт,спорт... **22.10** Храм. **22.40** «Все о Еве». Спектакль Центрального академического театра Советской Армии. **2**-я серия.

### Польша - 1

**07 00** Кофе или чай. **08 45** Беседа. **09 00** ""Мода на успех''. Сериал пр-ва США. **09 30** Телетурнир. **10 00** Новости. **10 10** Мама и я. **10 25** Дошкольники дома. **10 50** Гимнастика. **10 55** Поговорим о детях. **11 00** ""Слава''. Сериал пр-ва США. **11 50** Музыкальная программа. **12 00** Тедлежурнал. **12 15** Рыбы и рыбки. **12 30** Жизнь моя. **13 00** Новости. **13 10** Агробизнес. **13 15** Сельскохозяйственная программа. **13 40** Орфографи. **13 55** Мастера. **14 20** Гость дня. **14 25** Документальный фильм. **15 00** Большая история маленьких городов. **15 25** Каталог памятников. **15 35** Тележурнал. **15 40** Документальный фильм. **15 50** Программа на вечер. **16 00** Тележурнал. **16 30** ""Мода на успех''. Сериал пр-ва США. **17 00** Телетурнир. **17 30** Телеэкспресс. **17 50** Спортивная студия. **18 45** С камерой среди зверей. **20 00** Вечеринка. **20 30** Новости. **21 10** ""Похищение президента''. Фильм пр-ва США. **23 00** Пульс дня. **23 15** Всегда вечером. **00 00** Новости. **00 20** ""Хлеб''. Фильм пр-ва Израиля. **01 45** Программа католической редакции. **02 15** Развлекательная программа.

### Польша - 2

**08 00** Панорама. **08 10** Спортивная программа. **08 20** Утренний гость. **08 50** Академия здоровья. **09 00** Местная программа. **09 30** ""Все кроме любви''. Сериал пр-ва США. **10 00** Трансляция заседаний сейма. **16 00** Приветствие. **16 05** ""Виджет''. Сериал пр-ва США. **16 25** Академия здоровья. **16 35** Животные вокруг нас. **17 00** Документальный фильм. **17 30** Телетурнир. **18 00** ""Домик над озером''. Сериал пр-ва Германии. **18 55** Розыгрыш лото. **19 00** Панорама. **19 10** Местная программа. **20 00** Колесо фортуны. **20 35** Кроссворд. **21 00** Польская лига. **21 50** Спортивная программа. **22 00** Панорама. **22 35** Экспресс репортеров. **23 05** Телетурнир. **00 25** Документальный фильм. **01 15** Панорама. **01 20** Музыкальная программа.

## Чацьвер, 7 верасьня

### Белорусское телевидение

